Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 239 (4783) | НЯДЗЕЛЯ 29 КАСТРЫЧНІКА 1933 г. | № 239 (4783)

ГОД ВЫДАННЯ XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Двойчы чырвонасцяжнаму ленінскаму комсамолу ў дзень пятнаццацігоддзя

БОЛЬШЭВІЦКАЕ ПРЫВІТАННЕ!

ПРЫВІТАННЕ ТАВ. СТАЛІНА САКРАТАРУ ЦКМОЛА—ТАВ. КОСАРАВУ

ЛЕНІНСКАМУ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАМУ КОМСАМОЛУ, АРГАНІЗАТАРУ НАШАЙ СЛАЎНАЙ РЭВОЛЮЦЫЙНАЙ МОЛАДЗІ, У ДЗЕНЬ ЯГО XV-ГАДОВАГА ЮБІЛЕЯ—СЯБРОЎСКАЕ ПРЫВІТАННЕ!

ЖАДАЮ ЯМУ ПОСПЕХА Ў СПРАВЕ ВЫХАВАННЯ НАШАЙ МОЛАДЗІ Ў ДУХУ ЛЕНІНІЗМА, У СПРАВЕ ВЫХАВАННЯ НАШАЙ МОЛАДЗІ Ў ДУХУ НЕПРЫМІРЫМАЙ БАРАЦЬБЫ З ВОРАГАМІ РАБОЧАГА КЛАСА І ЎСЯМЕРНАГА ЎМАЦАВАННЯ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫХ БРАЦКІХ УЗ ПАМІЖ ПРАЦОЎНЫМІ ЎСІХ МОВАЎ І РАС СВЕТА.

УДАРНІКІ І ЎДАРНІЦЫ КОМСАМОЛА ПАКРЫЛІ СЯБЕ СЛАВАЮ Ў ПЕРЫЯД НОВАГА БУДАЎНІЦТВА ЗАВОДАЎ, ФАБРЫК, ШАХТ, ЧЫГУНАК, САЎГАСАЎ, КАЛГАСАЎ. БУДЗЕМ СПАДЗЯВАЦЦА, ШТО ЎДАРНІКІ КОМСАМОЛА ПРАЯВЯЦЬ ЯШЧЭ БОЛЬШ АДВАГІ І ПАЧЫНА Ў СПРАВЕ АСВАЕННЯ НОВАЙ ТЭХНІКІ ВА ЎСІХ ГАЛІНАХ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ, У СПРАВЕ ЎЗМАЦНЕННЯ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЦІ НАШАЙ КРАІНЫ, У СПРАВЕ ЎМАЦАВАННЯ НАШАЙ АРМІІ, НАШАГА ФЛОТА, НАШАЙ АВІЯЦЫІ.

ЗА XV ГОД СВАЙГО ЮНАВАННЯ ЛЕНІНСКІ КОМСАМОЛ СМЕЛА НЁС НАПЕРАД ВЯЛІКІ СЦЯГ ЛЕНІНА, ПАСПЯХОВА ЗБІРАЮЧЫ ВАКОЛ ЯГО МЛЬЁНЫ МАЛАДЫХ РАБОЧЫХ І СЯЛЯН, МЛЬЁНЫ МАЛАДЫХ РАБОТНІЦ І СЯЛЯНАК. БУДЗЕМ СПАДЗЯВАЦЦА, ШТО ЛЕНІНСКІ КОМСАМОЛ БУДЗЕ І Ў ДАЛЕЙШЫМ ТРЫМАЦЬ ВЫСОКА СЦЯГ ЛЕНІНА І З ГОНАРАМ ДАНЯСЕ ЯГО ДА ПЕРАМОЖНАГА КАНЦА НАШАЙ ВЯЛІКАЙ БАРАЦЬБЫ ДА ПОЎНАЙ ПЕРАМОГІ СОЦЫЯЛІЗМА.

НЯХАЙ ЖЫВЕ ЛЕНІНСКІ КОМСАМОЛ!

НЯХАЙ ЖЫВЕ ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ ЛЕНІНСКАГА КОМСАМОЛА!

І. СТАЛІН.

ПРЫВІТАННЕ ЦК УсеКП(б) ЛЕНІНСКАМУ КОМСАМОЛУ

Цэнтральны камітэт Усесаюзнай комуністычнай партыі (большэвікоў) у дзень XV-годдзя гераічнага чырвонасцяжнага Ленінскага комсамола шле комсамольскаму племені гарачае большэвіцкае прывітанне.

Сіла Ленінскага комсамола, многамільённага і маналітнага авангарда працоўнай моладзі, заключаецца ў тым, што выхаваны Лекіным і Сталіным, ён заўсёды высока нёс сцяг большэвіцкай партыі.

Гераічны шлях комсамола—шлях самаахвярнай адданасці партыі. Ператвараючы ў жыццё Ленінскія заветы, злучаючы ў сваёй барацьбе тэарэтычную вучобу з рэвалюцыйнай практыкай, комсамол выкоўвае з маладых рабочых і сялян свядомых і актыўных будаўнікоў комунізма.

«Комуністычны Саюз моладзі павінен быць ударнай групай, якая ва ўсякай рабоце аказвае сваю дапамогу, праяўляе сваю ініцыятыву, свой пачын» (ЛЕНІН). Верны гэтаму завету Леніна, комсамол заўсёды—і ў гады грамадзянскай вайны, і ў гады барацьбы за пяцігодку—быў і застаецца на перадавых пастах барацьбы за соцыялізм. Ініцыятар ленінскага соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, комсамол ішоў і ідзе ў авангардзе барацьбы за большэвіцкія тэмпы.

«Ленінскі комсамол быў і застаецца маладым рэзервам нашай рэвалюцыі» (СТАЛІН). Дзесяткі і сотні тысяч стойкіх маладых большэвікоў улілися ў чырвоную армію і флот, у саветы, праўленні калгасаў, кооперацыі і прафсаюзаў, у МТС і органы кіраўніцтва прамысловасці.

Вітаючы Вас, ЦК УсеКП(б) выказвае ўпэўненасць, што ў дзень XV-гадовага юбілея комсамольцы, комсамолкі і ўся працоўная моладзь яшчэ цясней згуртуе свае рады вакол большэвіцкай партыі і яе правадыра тав. Сталіна.

Па-большэвіцку змагайцеся за марксіцка-ленінскую вучобу, за аўладанне тэхнікай, за дапаўненне пафаса будаўніцтва пафасам асваення новых заводаў і новай тэхнікі, за тое, каб зрабіць калгасы большэвіцкімі, а кожнага калгасніка—заможным. Па-большэвіцку змагайцеся за ўмацаванне магутнасці Чырвонай арміі. Па-большэвіцку змагайцеся за інтэрнацыянальнае, комуністычнае яднанне пролетарыяў усіх краін, супроць імперыялістычных войн, за ліквідацыю капіталізма, за перамогу соцыялізма ва ўсім свеце.

ЦК УсеКП(б).

ПРЫВІТАННЕ ЦК КП(б)Б

ЦК КП(б)Б у дзень пятнаццацігадовага юбілея УсеЛКСМ шле сваё большэвіцкае прывітанне Усесаюзнаму Ленінскаму комуністычнаму Саюзу Моладзі. Народжаны ў баях за дыктатуру пролетарыята, выхаваны ЛЕНІНЫМ і СТАЛІНЫМ, комсамол заўсёды і ўсюды з'яўляўся і з'яўляецца вернейшым дапамочнікам партыі ў барацьбе за ўмацаванне заканадаўства пастрыгніка, у барацьбе за перамогу соцыялізма, за пабудову бясклассавага соцыялістычнага грамадства.

Вялізарныя задачы стаяць перад сустаўной часткай усесаюзнага комсамола—комсамолам БССР. Зрабіць БССР перадавой соцыялістычнай савецкай рэспублікай, аўладаць вышынямі культуры і тэхнікі, дапаўніць пафас будаўніцтва пафасам асваення тэхнікі, ператварыць усе калгасы ў большэвіцкія, а ўсіх калгаснікаў у заможныя, яшчэ больш умацаваць пролетарскі інтэрнацыяналізм, узняць абаронна-палітычны ўзровень. Гэтыя задачы, якія стаяць перад партыяй і ўсім рабочым класам, з'яўляюцца рашаючымі галінамі работы КСМ, на якіх павінна быць сканцэнтравана ўся энергія, ініцыятыва і энтузіязм рабочай і калгаснай моладзі БССР.

ЦК КП(б)Б упэўнен, што комсамол БССР — адзін з перадавых атрадаў УсеЛКСМ, упісаўшы такія слаўныя старонкі ў гісторыю барацьбы і соцыялістычнага будаўніцтва БССР, будзе і ў далейшым у першых радах барацьбы за справу Леніна-Сталіна.

Працуючы на адказнейшым участку будаўніцтва соцыялізма, на стыку з капіталістычным светам, комсамол БССР, слухаючы ўказаннямі правадыра і настаўніка партыі тав. СТАЛІНА, павінен на справе, а не дэкларацыйна, з дапамогай ЦК КП(б)Б і кіраўніцтва усёй сваёй работай па будаўніцтву соцыялізма, па барацьбе з класавым ворагам, пазбягаючы рэвалюцыйную пільнасць, умацоўваючы пролетарскі інтэрнацыяналізм, пролетарскую салідарнасць, служыць узорам і прыкладам рабочай і працоўнай моладзі па той бок савецкай граніцы ў яе барацьбе з фашызмам і капіталізмам, за перамогу сусветнай пролетарскай рэвалюцыі.

Няхай жыве ленінскі комсамол!

Няхай жыве тав. СТАЛІН—любімейшы правадыр і настаўнік сусветнага пролетарыята!

ЦК КП(б)Б.

Саюз Комуністычнай моладзі павінен быць ударнай групай, якая ва ўсякай рабоце аказвае сваю дапамогу, праяўляе сваю ініцыятыву, свой пачын. Саюз павінен быць такім, каб любы рабочы бачыў у ім людзей, вучэнне якіх магчыма яму незразумела, вучэнню якіх ён адразу можа быць і не паверыць, але на жывой рабоце якіх, на іх дзейнасці ён бачыў-бы, што гэта сапраўды тыя людзі, якія паказваюць яму верны шлях.

Вл. І. Ленін.

Забяспечыць давер'е моладзі да нашай партыі, забяспечыць кіраўніцтва нашай партыі ў комсамоле—такава задача. Комсамолец павінен памятаць, што забеспячэнне кіраўніцтва партыі ёсць самае галоўнае і самае важнае ва ўсёй рабоце комсамола. Комсамолец павінен памятаць, што без такога кіраўніцтва комсамол не можа выканаць сваю асноўную задачу выхавання рабоча-сялянскай моладзі ў духу дыктатуры пролетарыята і комунізма.

І. Сталін.



НАРКАМВАЕНМОР ТАВ. ВАРАШЫЛАЎ —КОМСАМОЛУ

МАСКВА. ЦК УсеЛКСМ—тав. КОСАРАВУ

Таварышы комсамольцы! Вам, доблесным байцам — будаўнікам, вам, энтузіястам, дзеячам нашага новага пролетарскага жыцця ў дзень вашага свята — слаўней XV гадавіны — маё сяброўскае чырвонаармейскае найвялікшае прывітанне.

Усёй душою вітаю таксама тых таварышоў, хто праз цудоўную комсамолію загартоўваўся, у яе «сямі водах» вымяраўся, праходзіў праз яе «чысцілішча» і папаўняў ленінскія кагорты нашай партыі на працягу гэтых пятнаццаці год.

За мінулыя XV год комсамол вырас у гіганцкую сілу. Справы комсамола, праспаўленыя на ўвесь свет, служаць узорам для ўсяго працоўнага чалавецтва ў яго барацьбе за поўнае вызваленне працы.

Наша партыя, урад, усе працоўныя саветаў з любоўю два разы адзначылі комсамол вышэйшай пролетарскай узнагародай — ордэнам чырвонага сцяга за баявыя геройствы ў грамадзянскай вайне і ордэнам працоўнага чырвонага сцяга за геройствы на соцыялістычнай будоўлі.

Ленінскі комсамол — гэта дастойнейшы сын сваёй вялікай матцы — ленінскай партыі. Як і ўсякі сын, комсамол «не бязгрэшан». Не, ён па «юнацтву гадоў сваіх» і не толькі з прычыны гэтага, мае шмат яшчэ недахопаў. Але яго выключныя вартасці, як арганізацыі, выхоўваючай справай кожнадзённа сапраўдных байцоў за новае жыццё — вялізарныя, усё перакрываючыя.

І ўсё-ж, таварышы, следуючы трафарэту, у даным выпадку, патрэбнаму, я жадаю вам стаць яшчэ лепшымі, яшчэ больш слаўнымі, яшчэ мацней па-ленінску спаянымі.

Уступаючы ў чацвертую пяцігодку сваёй гісторыі, комсамол, па мойму, павінен пастаўіць перад сабой задачу — побач са стварэннем мільённаў ударнікаў соцыялістычнага будаўніцтва, побач з фармаваннем соцень тысяч камандзіраў прамысловасці, сельскай гаспадаркі і Чырвонай арміі, побач з выпускам усё новых і новых кадраў у навуку, мастацтва, народную асвету і ахову здароўя, побач з усім гэтым комсамол абавязан перарабляць, перавыхоўваць і наноў ствараць новага комуністычнага чалавека.

Новае жыццё, якое разгортваецца на моцна закладзеным соцыялістычным фундаманце ў нашай краіне, патрабуе і новага, зусім новага сапраўднага, да гэтага яшчэ нябачанага чалавека. Гэтага чалавека павінен пачаць фармаваць, рабіць наш доблесны ленінскі комсамол.

Што гэта значыць? Гэта значыць многае і між іншым наступнае: комсамолец павінен многа, пастаянна і добра вучыцца, каб многа і па-сапраўднаму ведаць. Комсамолец павінен мець усебаковую асвету. Комсамолец абавязан стаць высокакультурным. Комсамолец не можа не быць узорна, па-большэвіцку дысцыплінаваным.

Комсамольцы павінны расці як сапраўдныя большэвікі-ленінцы, памятаючы, што іменна з іх у неадлёкім будучым цэлым будзе складацца наша партыя.

Чырвонасцяжны комсамол, які прадстаўляе сабой магутную сілу, усё можа, ён усё зробіць. Ён быў заўсёды ленінскім, ударным, ён імі будзе ў кубе.

Яму, слаўнаму, нашаму харошаму юбіляру, чырвонаармейскае ўра!

ВАРАШЫЛАЎ.

ДА ПЯТНАЦЦАЦІГОДДЗЯ КОМСАМОЛА

Пятнаццаць год комсамольскай арганізацыі ёсць пятнаццаць год барацьбы мільёнаў моладзі пад кіраўніцтвам партыі за непасрэдныя інтарэсы і канчатковыя ідэалы пролетарыята. Цяжка ў штодзённай практычнай дзейнасці правесці падзяляючую грань паміж большэвікамі і комсамольцамі, бо комсамольская арганізацыя ўвабрала ў сябе пераважную большасць самай лепшай часткі рабочага класа і калгаснага сялянства ва ўзросце ад 15—17 да 25—27 год, г. зн. найбольш актыўную і жыццядзейную частку насельніцтва Саюза ССР.

Я не ведаю ў нас такой сферы дзейнасці, дзе-б комсамол не быў актыўным удзельнікам. І гэта, натуральна, так і павінна быць. Комуністычная-ж партыя з'яўляецца адзінай партыяй у свеце, якой непасрэдна належыць не толькі сённяшні, але, што асабліва важна, і заўтрашні дзень, якая кліча наперад, ператварэнне ў жыццё ідэалаў якой знімае поўнасцю ажовы прыняцтвалікаў з працоўных мас. А гэтыя ідэалы партыі з'яўляюцца таксама ідэаламі і комсамола. Лінія барацьбы за дасягнення гэтых ідэалаў, намечаная партыяй у асобе не выканаўчых органаў і перш за ўсё ЦК, пад кіраўніцтвам правадыра партыі і рабочага класа т. Сталіна, гэта і ёсць асноўная лінія практычнай дзейнасці, генеральная лінія партыі, барацьба за ператварэнне якой у жыццё набліжае дзень канчатковай перамогі пролетарыята.

Комсамольская арганізацыя з'яўляецца актыўным правадніком лініі партыі. Яна выхоўвае ў барацьбе і на практычным яе правядзенні комсамольскія масы. Комсамольская арганізацыя свята захоўвае і заўсёды ставіць перад сваімі масамі інтэрнацыянальныя задачы пролетарыята, звязваючы сваю штодзённую работу і практычныя дасягненні з гэтымі задачамі. Яна актыўна змагаецца з усімі відамі апартунізма, скрыўляючымі лінію партыі.

Нідзе ў свеце ўзрост, уласцівы на шаму комсамолу, не адыгрывае такой творчай ролі, як у Совецкім саюзе. У гэтым ёсць значная заслуга комсамольскай арганізацыі, згуртаваўшай над сваім сцягам мільёны моладзі. Хіба можна было мець такія гіганцкія рэзультаты ў індустрыялізацыі краіны без таго гарачага падрымання, без таго энтузіязма, з якім комсамол праводзіў і праводзіць у жыццё гэты лозунг? Баявыя атрады комсамольцаў усюды: у вугольных капальнях і на буравых скважынах нафтапромыслаў, ля варштатаў машынабудаўнічых гігантаў і ў рудніках, ля доменных печаў і на электрастанцыях. З вытворчасці льюцца комсамольскія патокі ў тэхнікумы, ВНУ, ВТНУ і навукова-даследчыя інстытуты, адкуль жывіцца прамысловасць арганізатарамі, інжынерамі і тэхнікамі. Можна ад душы пажадаць, каб разам з вытворчасцю раслі вытворчая дысцыпліна і пачуццё адказнасці за даручаную справу.

Нельга абыйсці маўчаннем і вялізарную работу, якую выконвае комсамол у вёсцы. Не гаворачы ўжо аб тым, што ён з'яўляецца ў вёсцы найбольш прагрэсіўным пластом насельніцтва, комсамолам праведзена вялікая работа ў калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Комсамольцы паказвалі і паказваюць сябе лепшымі вытворцамі на ўдасканаленых сельгасмашынах: на трактарах, камбайнах і г. д. Яны найбольш успрымальны да інтарэсаў совецкай, соцыялістычнай дзяржавы ў правядзенні дзяржаўных абавязкаў. Вельмі значна комсамольская прослойка сярод вясковых арганізатараў — брыгадзіраў, старшынь калгасаў і старшынь сельсветаў.

Удзел комсамола ў абароне краіны, якая з'яўляецца адной з важнейшых і адказнейшых функцый дзяржавы, не раз адзначалася партыяй і ўрадам па заслугах. Сама колькасць комсамола ў арміі прадвызначае вялізарную ролю яго ў будаўніцтве ўзброеных сіл.

Гэты невялікі пералік, правільней — кароткае нагадванне аб значэнні і той ролі, якую адыгрывае ў нас комсамол у соцыялістычным будаўніцтве, ускладае вялізарную адказнасць на комсамольскую арганізацыю.

Вітаю ўсіх вас у дзень вашага слаўнага пятнаццацігадовага юбілея і ад душы жадаю вам далейшых поспехаў у барацьбе за комунізм.

М. І. КАЛІНІН.

ЛЕНІНСКАМУ КОМСАМОЛУ— У ДЗЕНЬ ЯГО XV-ГОДДЗЯ

Большэвіцкае прывітанне вам, дарагія таварышы!

Віншую з XV-годдзем гераічнай барацьбы і вялікіх перамог Ваш XV-гадовы юбілей супадае з XVI годдзем Совецкага Саюза.

Разам з першай у свеце краінай дыктатуры пролетарыята раслі вы. У барацьбе за яе вы мацнелі, загартоўвалісь, накаплялі баявы вопыт.

Слаўны шлях пройдзен за гэтыя XVI год. Гонарам барацьбітоў-пераможцаў пачуваюцца вашы сэрцы пры погляде на гэты шлях. Барацьба за захват і ўтрыманне ўлады, за адпаўленне разбуранай вайной гаспадаркі, за пабудову фундамента соцыялістычнай эканомікі і вырашэння пытання «хто каго» на карысць соцыялізма, за поўную пабудову соцыялізма — вось асноўныя этапы гэтага баявога шляху. На кожным з гэтых этапаў комсамол заўсёды ішоў і ідзе ў першых радах барацьбітоў, ушчуваючы і запальваючы сваім энтузіязмам і гераізмам мільённыя масы рабочай і працоўнай моладзі.

Таварышы комсамольцы! Ваша сіла — ў кіраўніцтве магутнай, выкрабаванай УсеКП(б) на чале з правадыром партыі і міжнароднага пролетарыята—тав. Сталіным; ваша сіла — ў большэвіцкай непрымірымасці, у барацьбе супроць усіх і ўсякіх ухілаў ад ленінскай лініі, ад усіх і ўсякіх праяўленняў апартунізма; ваша сіла — ў сувязі з многамільённымі масамі рабочай і калгаснай моладзі; ваша сіла — ў правільным спалучэнні рэволюцыйнай практыкі з вывучэннем тэорыі Маркса—Леніна—Сталіна; ваша сіла — ў інтэрнацыянальным значэнні той справы, за якую вы змагаецеся, як перадавы атрад міжнароднага комуністычнага юнацкага руху.

Складанейшыя сусветна-гістарычнага значэння задачы стаяць перад намі на даным этапе. Барацьба за асваенне новай тэхнікі, за большэвіцкія калгасы, за высокі жыццёвы ўзровень і культуру рабочага класа і калгасных мас, за далейшае ўмацаванне абароназдольнасці СССР, за выкананне другой пяцігодкі,—усё гэта — барацьба за поўную пабудову бясклассавага грамадства.

Няхай ваша XV-годдзе ўзброіць вас новым запасам энергіі для новых вялікіх перамог.

Няхай кожная старонка гэтага гераічнага XV-годдзя стане зброяй выхавання новых пакаленняў, здольных завяршыць пабудову комуністычнага грамадства.

П. ПОСТЫШАЎ.

ПРЫВІТАННЕ ТАВ. МОЛАТАВА ДА XV-ГОДДЗЯ КОМСАМОЛА

За XV год комсамол ператварыўся ў вялізарную сілу, больш чым у 4-х мільённую армію маладых байцоў за комунізм. Тысячы перадавікоў, вышаўшых з радоў комсамольцаў і комсамолак, цяпер цвёрда стаяць на пастах кіраўнікоў розных участкаў фронта соцыялістычнага будаўніцтва і ў Чырвонай арміі. А галоўнае—комсамол рос і мацнеў, як верная апора нашай Ленінскай партыі, як яе надзейны і невычарпальны рэзерв, на справе і з гонарам апраўдваючы сваё слаўнае імя ленінскага комсамола.

Пераможныя поспехі соцыялізма ў нашай краіне і перабудова ў сувязі з гэтым усёй гаспадаркі і культуры народаў Совецкага Саюза не могуць не выклікаць жорсткага супраціўлення з боку ворагаў вызвалення рабочых і працоўных сялян, з боку рэшткаў эксплаататарскіх класаў. Усё гэта азначае, што барацьба за соцыялізм прад'яўляе цяпер да комсамольцаў і комсамолак новыя і пры тым больш высокія патрабаванні ў адносінах большэвіцкай палітычнай свядомасці, у адносінах усваення навукі і сапраўднага накаплення ведаў, у адносінах арганізаванасці і дысцыпліны на фабрыцы і ў калгасе, на вучобе і ў Чырвонай арміі, у адносінах актыўнасці моладзі ва ўсёй практычнай, гаспадарчай і культурнай рабоце совецкай дзяржавы. Наша рабочая і сялянская моладзь раўняецца па комсамолу, бачыць у ім прыклад для сябе, і гэта накладвае на комсамольцаў і перш за ўсё на комсамольскі актыў асаблівую адказнасць у разгортванні барацьбы за аўладанне навукай, за асваенне тэхнікі, за поспехі ў вытворчасці, за ўмацаванне калгасаў у вёсцы. А іменна-ж на гэтым фронце мы даем зараз бой ворагам рабочага класа. Совецкая ўлада стварыла ў нашай краіне небачана спрыяльныя ўмовы для развіцця здольнасцяй, талантаў моладзі. Для моладзі працоўных класаў, з якой раней толькі рэдкія шчасліўчыкі маглі прабіць сабе шлях да навукі, да сур'ёзнай вучобы і шырокіх ведаў, разам з тым для ўсёй масы моладзі створаны ўмовы для ўдзела ў вытворчасці на карысць усяго народа, для работы на сябе і на працоўных, а не на буржуазных паразітаў. Задача комсамола заключаецца ў тым, каб рабочая і сялянская моладзь усю сваю вучобу і працу непарыўна звязвала з практычнай барацьбой за справу комунізма, з штодзённай барацьбой за перамогу дыктатуры пролетарыята, з барацьбой за перамогу ўсіх і ўсякіх дзяжасцяй на гэтым шляху. У гэтым—аснова комуністычнага выхавання моладзі. Гэтаму вучыў нас Ленін, гэтаму вучыць нас Сталін, гэтаму вучыць наша партыя.

Не пакладаючы рук вучыцца, авалодваючы навукамі і засвойваючы сутнасць марксізма-ленінізма; сумленна працаваць на сваім пасту, развіваючы актыўнасць у соцыялістычным спаборніцтве, і змагацца ў радах працоўных за перамогу комунізма, укладваючы душу ў практычную работу па соцыялістычнаму будаўніцтву і абароне краіны, звязаць гэтыя задачы ў адно цэлае—у гэтым задача рабочага класа і працоўных нашай краіны, у гэтым у асаблівасці задача нашага маладога комуністычнага пакалення.

І няхай кожны комсамолец і кожная комсамолка, а разам з імі і ўся рабоча-сялянская моладзь памятае аб тым, што наша барацьба, работа, вучоба і нашы поспехі ва ўсім гэтым—надзея і гонар рабочых усяго света, якія змагаюцца за сваё вызваленне ад капіталізма.

Ленінскі комсамол стаў магутнаю сілаю пад кіраўніцтвам нашай партыі. Яго сіла і роля ў барацьбе за справу комунізма, няўхільна растуць.

Ленінскаму комсамолу, вернай апоры і памочніку Ленінскай партыі, большэвіцкае прывітанне!

В. МОЛАТАЎ.

ПРЭЗІДЫУМ УСЕСАЮЗНАГА ТАВАРЫСТВА СТАРЫХ БОЛЬШЭВІКОЎ—ЛЕНІНСКАМУ КСМ

Старэйшы атрад ленінскай гвардыі шле баявое большэвіцкае прывітанне маладым ленінцам, сваёй надзейнай большэвіцкай змене.

Таварыства аддае і гатова аддаць лепшыя сілы на перадачу маладому пакаленню рабочых і працоўных багаты вопыт барацьбы партыі за соцыялізм. Дапамагаючы сваёй партыі выхаваць мільёны маладых ленінцаў у духу большэвіцкай непрымірымасці да ўсіх ворагаў комунізма, у духу жалезнай большэвіцкай дысцыпліны.

Няхай жыве УсеЛКСМ!

Прэзідыум Усесаюзнага Таварыства Старых

ПЯТНАЦЦАЦІГОДДЗЕ УсеЛКСМ

Аўладаць навукай, выкаваць новыя кадры большэвікоў-спецыялістаў па ўсіх галінах ведаў, вучыцца, вучыцца, вучыцца самым упартым чынам—такава цяпер задача *(Сталін)*

ДАВЕР'Е, АПРАУДАНАЕ У БАЯХ

У кастрычніку 1917 года рабочая моладзь выступіла, як адна з баявых сіл нашай партыі за ўстаноўленне дыктатуры пролетарыята.

Адносна ролі рабочай моладзі ў пролетарскім паўстанні Ленін пісаў: «Трэба «выпучыць самыя рашучыя элементы (малых ударнікаў і рабочую моладзь, а таксама лепшых матросаў) у невялікія атрады для заняцця імі ўсіх важнейшых пунктаў, для ўдзела ўсюды, за ўсіх важнейшых операцыях».

Вядомы ленінскі рад выкаванняў Леніна, паказваючых, якую вялікую дамову партыі прызначаў ён за працоўнай моладзю.

Гэта давер'е правадыра нашай партыі і сяброўства пролетарыята рабочай моладзі Совецкага Саюза з гонарам апраўдала.

Працоўная моладзь апраўдала гэта давер'е ў баях, ідучы на заклік партыі, не шкадуючы сіл, энергіі, жыцця.

Адозвы комсамольскіх з'ездаў падмацоўваліся баявымі атрадамі комсамольцаў, якія накіроўваліся на фронт.

Імя Леніна пятнаццацігадовага гісторыя ўвяслена крывёю лепшых сыноў краіны сацыялізма, аддаўшых жыццё у баях за дыктатуру пролетарыята.

Гэты жыццёвы шлях складаецца з тысяч геройскіх учынкаў, імі пад кіраўніцтвам партыі Леніна здзяйнала самаадданая гераічная барацьба маладых пакаленняў на франтах грамадзянскай вайны і сацыялістычнага будаўніцтва.

I.

Увесь час, усю гісторыю да барацьбы працоўная моладзь, арганізаваная пад знамем ленінскага комсамола, пераносіла на гаспадарчы фронт, на барацьбу за выкананне гаспадарчапалітычных задач, пастаўленых партыяй.

Ленінскі комсамол БССР — сустаўная частка шматмільённага комсамола—ушэсаў у пятнаццацігадовую гісторыю УсеЛКСМ не адну гераічную старонку барацьбы з акупантамі, удзела у партызанскіх атрадах. ЛКСМБ актыўна і ладна дапамагаў і дапамагае партыі ў індустрыялізацыі Совецкай Беларусі, у калектывізацыі сельскай гаспадаркі, у барацьбе за развіццё культуры, нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зместу. І толькі большэвіцкаму кіраўніцтву камуністычнай партыі абавязан ЛКСМБ гэтымі дасягненнямі.

Комсамол сустракае сваё пятнаццацігоддзе ўдзямам вытворчай ініцыятывы, рапартуе Цэнтральнаму Камітэту партыі і Цэнтральнаму Камітэту комсамола масавымі вытворчымі паляраміямі.

Комсамольцы калектыва БелДРЭС у парадку выканання абавязкаў, узятых на сябе ў часе падрыхтоўкі да юбілея, адрамантавалі у нерабочы час такарны станок. Комсамольцы арганізавалі суботнік на вытвараснай гаспадарцы ў карысць ленінскай авіяэскадрыльі імя X з'езда ЛКСМБ. Па ініцыятыве комсамольскай арганізацыі пачаўся конкурс на лепшае «бедуючае» рабочых. Змагаючыся за выкананне пасці умоў тав. Сталіна, комсамольская арганізацыя пачынае барацьбу за такія пытанні, як паверка таго, наколькі пад рыхтаваны статары рабочых да зімы, як сакрэтарыят гарадзкіна і інш. Рэйд па гэтаму пытанню праводзіць «лёгкая кавалерыя» БелДРЭС'а.

З пачэсці вытворчым уздымам сустракаюць сваёй комсамольцы фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», фабрыкі, якая мела сур'ёзныя прарывы.

Моладзьная істужка імя «совецкай спартакіяды выканала план першай паловы кастрычніка на 109,5 проц., істужка імя КІМ — 107,3 проц., імя X з'езда ЛКСМБ — 102,6 проц. У гэтых істужках і брыгадах працуюць не толькі комсамольцы, але і шмат беспартыйнай рабочай моладзі. Комсамольцы арганізавалі яе, узначалілі яе ініцыятыву, дамагліся выканання вытворчага плана і дастойна сустракаюць юбілей.

Комсамольцы **віцебскага трамвая** рапартавалі аб выкананні ўзятых абавязкаў: — праведзен комсамольскі суботнік і датэрмінова пушчана ў эксплаатацыю шырока-далёкая дарога віцебскага трамвая.

Можна прывесці яшчэ шмат фактаў такога-ж самага парадку.

Комсамольская брыгада тав. **Дарашэнка** (6 вагонны ўчастак менскага вуза) у падарунак 16-годдзю ЛКСМБ адрамантавала жыш плана 3 пасажырскіх вагоны. Комсамольцы **Чартоў, Якавец і Дарашэвіч сістэматычна перавыконваюць норму выпрацоўкі.**

Юбілей з'явіўся датай яшчэ большай мабілізацыі шырокіх мас комсамольцаў і працоўнай моладзі на ліквідацыю прарываў, на ўздым вытворчасці.

II.

Правадыр нашай партыі тав. **Сталін** сказаў: **«Пафас будаўніцтва мы павінны дапоўніць пафасам аўладання тэхнікай».** Комсамольцы, рабочая моладзь павінны паказаць узоры большэвіцкага аўладання тэхнікай.

ЦК УсеЛКСМ заклікаў «усіх маладых пролетарыяў Совецкага Саюза адзначыць пятнаццацігоддзе УсеЛКСМ выкананнем абавязкаў па аўладанні тэхнікай». Барацьба за аўладанне тэхнікай, барацьба за здачу норм па тэхнічнаму мінімуму кожным маладым рабочым ёсць неадкладная асноўная частка ўсёй вытворчай работы комсамола.

Уся практыкаванасць, цямлівасць, рухомасць маладой думкі накіравана на тое, каб аўладаць вышынямі індустрыяльнай культуры.

Зараз гэтага партыя патрабуе ад сваёй змены.

Комсамольцы **завода імя Варашылава** адзначаюць юбілей узмацненнем тэхнічнай вучобы. Да юбілея комсамольская арганізацыя завода праводзіць тэх экзамен першай дзесяткі комсамольцаў, ужо аўладаўшых тэхмінімумам.

Вось прыклады таго, якіх надзвычайных вынікаў дасягнуць комсамольцы ў гэтай галіне.

На фанерным заводзе **«Звязда» (Віцебск)** у ліпені месяцы ўстаноўлен лучэчны варштат навейшай замежнай сістэмы «Ролер» на выпуску экспартнай фанеры. Ні адзін рабочы на заводзе не мог працаваць на гэтым варштаце. Комсамолец **Коцін** задаўся мэтай авоіць тэхніку лучэчнага варштата. Упартай напружанай работай над кіраўніцтвам бялынера Коціна вывучыў варштат і здаў тэхэкзамен на «добра».

Комсамолец **Пухавіцкі** на магілёўскім заводзе **«Чырвоны адраджэнец»** разам з групай маладых рабочых авоіў вытворчасць складаненькіх замежных мехаізмаў для пчаціпнай прамысловасці.

Святкаванне юбілея комсамола супадае з гадавінай узяцця шэфства комсамолам над ваенна-марскім флотам.

Флоцкі комсамол паказвае ўзоры баявой работы.

Вось што расказвае камісар лінкора тав. **Бакупін**, які прыехаў да сваіх шэфаў для ўдзела ў святкаванні юбілея:

— **Курт-Мамет** — малодшы камандзір электра-тэхнічнага дывізіёна. Яго аддзяленне мае 3-х комсамольцаў. Аддзяленне комсамольца Курт-Мамета не мае ні адной правіннасці. Норму баявой падрыхтоўкі аддзяленне здала на «добра».

—**Лук'янаў** — малодшы камандзір машыннай групы — служыць узорам для ўсіх байцоў.

— Узоры ў большэвіцкім аўладанні тэхнікай паказваюць комсамольцы ячэйкі машыннай групы. У гэтай ячэйцы 16 лепшых комсамольцаў арганізавалі тэхнічныя гурткі, дадатковыя тэхзаняткі. У выніку — **комсамольцы хутка дагналі «старыкоў». Добра авалодваюць складанай тэхнікай валоўных машын, самастойна стаяць на варце пры ўсіх механізмах.**

Расце маладое племя канструктароў, тварцоў новых, складанейшых у свеце механізмаў соцыялістычнай тэхнікі. Маладыя байцы-комсамольцы выходзяць **самастойна** на варту да самых адказных механізмаў.

Гэтых дасягненняў ленінскі комсамол пад кіраўніцтвам партыі дабіўся ўжо на першых кроках разгорнутага масавай барацьбы за аўладанне вышынямі індустрыяльнай культуры.

Ільіч пісаў: **«найгоршае мападых памочнікаў на час, месяц - два замясціць вышэйшыя пасады і будзе ўпэўнены, што пры зусім нязначнай страце для справы ў апошнім і цэлым справа пра шэнна выйграе... Час вазны, моладзь вырашыць выход барацьбы...»**

«Маладыя памочнікі» партыі — ленінскі комсамол, маючы блінкучую праграму — прамову Ільіча на III з'ездзе, пад кіраўніцтвам партыі і лепшага вучня Леніна — тав. Сталіна змагаецца за рэалізацыю гэтых указанняў. І ўжо зараз комсамол даў партыі, даў краіне інжынераў, тэхнікаў, рабочых, якія з вялікай карысцю для справы працуюць на фабрыках, заводах, у МТС.

III.

Вызначаючы характар саюза моладзі, тав. **Сталін** сказаў, што комсамол з'яўляецца свабодная арганізацыя, якая яднае маладых рабочых і сялян. Але, — падкрэсліваў тав. Сталін, — «необходна кіруючую ролю ў комсамоле забяспечыць да пролетарскім элементам.

Комсамол працабіў вялікую работу па выкананні гэтага ўказання тав. Сталіна. Праведзен рад мабілізацый на работу ў вёску. У парадку выканання гэтага ўказання т. Сталіна, ЦК ЛКСМБ накіраваў для работы ў калгасы БССР 600 лепшых комсамольцаў-ударнікаў з вытворчасці.

Матарылы завочнай нарады шасцісотнікаў, якую зараз праводзіць ЦК ЛКСМБ на старонках **«Чырвонай змены»**, паказваюць, якія ўзоры ў арганізацыі шырокіх мас калгаснага комсамола і беспартыйнай калгаснай моладзі на барацьбу за выкананне гаспадарча-палітычных задач паказалі яны на практычнай рабоце. Шасцісотнікі — прадстаўнікі пролетарскіх арганізацый саюза ў калгаснай вёсцы — паказалі сябе, як лепшыя дапаможнікі партыі ў вялікай рабоце па большэвізацыі калгасаў, за заможнае жыццё калгаснікаў.

***

Сваё пятнаццацігоддзе ленінскі комсамол адзначае вялікімі перамогамі на ўсіх франтах соцыялістычнага будаўніцтва. Гэтымі перамогамі комсамол абавязан толькі кіраўніцтву партыі.

Ленінскі комсамол на гэтым не спыняецца. **Юбілей — дата мабілізацыі.**

Яшчэ больш згуртаваўшы свае рады, рашуча ачышчаючыся ад усіх прымазаўшыхся, перараджэнцаў, змагаючыся за большэвізацыю сваіх радоў, ЛКСМБ пад кіраўніцтвам партыі аддасць усе свае сілы на далейшае развіццё народнай гаспадаркі БССР.

І. ШАПІРА.

РОСТ КОМСАМОЛА

ГАДЫ	Лік членаў і кандыдатаў УсеЛКСМ	Лік ячэек
1917-18	15.000	—
1919	96 000	—
1921	400.000	—
1925	1.140,706	39.797
1933	4.547.186	155.008

ПАРТЯДРО У КОМСАМОЛЕ

ГАДЫ	Колькасць комсамольцаў, членаў УсеКП(б)	Процант комуністаў да агульнага ліку членаў УсеЛКСМ
1924	33.380	9,4
1927	172.009	8,8
1929	234.724	10,4
1931	228.630	7,4
1933	385,382	8,5

ПРАСОУВАЦЬ У ЖЫЦЦЁ НОВЫЯ ДАСЯГНЕННІ НАВУКІ І ТЭХНІКІ

Зварот буйнейшых вучоных СССР да комсамола

Дарагія таварышы комсамольцы!

Пятнаццаць год назад вы аб'ядналіся ў Саюз комуністычнай моладзі. Вы ўступілі ў жыццё адначасова з адраджэннем краіны і разам з ёю паступова праходзіце ўсе этапы яе развіцця. Многае, чаго старшым пакаленням прыходзілася дабівацца ўпартай працай і барацьбой, вам дана з першых крокаў вашага жыцця, і ў гэтым ваша перавага перад імі.

Наша краіна ўся перабудоўваецца або будуецца нанава. Упяршыню праводзячы ў сябе новыя прынцыпы дзяржаўнага будаўніцтва, яна стварае ў розных мясцах сваёй вялізарнай тэрыторыі новыя цэнтры, вакол якіх збіраюцца лепшыя сілы краіны. Яна пакрываецца гігантамі індустрыі, у сваю чаргу стымулюючымі развіццё сырцовай базы, якая яе жывіць. Блізасць комсамола да вытворчасці, патрабуючай у кожны момант удзела ў ёй навуковай мыслі і рэальнай садзейнасці з боку навукі і тэхнікі, дапа вам магчымасць, карыстаючыся ўказаннямі вашых старшых таварышоў, самім прымаць удзел у вялікім будаўніцтве нашага Саюза. Развіццё як тэарытычных, так і прыкладных ведаў ідзе наперад хуткімі тэмпамі ў нашым Саюзе, у процілегласць Захаду, дзе крызіс, які з'яўляецца вынікам капіталістычнага лада, выклікае неабходнасць затрымліваць развіццё навукі, згортваць навуковыя ўстановы, а слыненне ў развіцці, як вы ведаеце, раўназначна кроку назад.

Каб належным чынам адзначыць пятнаццацігоддзе сваёй работы на карысць Саюза, няхай наш комсамол і яго друк паставяць сабе задачай сквазны кантроль над правядзеннем у жыццё ўсіх дасягненняў совецкай навукі і тэхнікі, над выпрабаваннем усіх удасканаленняў і новых вынаходніцтваў, над своячасовым апублікаваннем даследванняў, прадназначаемых для друку, бо гэта павядзе да новых дасягненняў нашага Саюза, да новых завяваванняў навукі і тэхнікі.

Дарагія таварышы! Вы з юных гадоў выхаваны на прынцыпах, якія з'яўляюцца асновай усяго будаўніцтва нашага Саюза. Краіна робіць усё магчымае для стварэння вам спрыяльных умоў у даны момант і для забеспячэння вашай будучыні, і яна мае права патрабаваць ад вас многага. У дзень вашага свята возьміце на сябе ўдзячную задачу кантроля над бесперабойным правядзеннем у жыццё новых дасягненняў навукі і тэхнікі. Будзьце ўпэўнены, што і мы ўсе, вашы старшыя таварышы, горача верачы ў вялікае, светлае будучае нашай краіны, гатовы аказваць вам усямернае падтрыманне ў вашай цяжкай, але і ганаровай рабоце.

Акадэмікі: А. П. КАРПІНСКІ, А. БАРЫСЯК, С. І. ВАВІЛАЎ, А. А. БАЙКОЎ, М. А. ПАЎЛАЎ, ГРЭБЕНШЧЫКАЎ, праф. СЕЛІВАНАЎ, праф. КАРНАУХАЎ і праф. ГУТЦОН.

Цэхі маладосці

Дзіўныя цэхі гэтай фабрыкі! Усюды моладзь, ва ўсёй рабоце адчуваецца юнацкі задор. Толькі таму тут мусіць і не ведаюць невыканання вытворчых планаў і брак прадукцыі даведзен да мінімума.

Тав. ВАЙЦЭХОВІЧ—сакратар лепшай у Слуцкім раёне комсамольскай ячэйкі калгаса «Новае жыццё».

Народ малады, вясёлы, энергічны. Воды, набытыя ў сямігодцы, іх не задавольняюць, яны жадаюць ведаць як мага больш і як мага грунтоўней. І не дзіва, што на вечарах сустрэчы з старымі большэвікамі, а потым з пісьменнікамі яны іх трымалі да позняй ночы, прасілі як мага больш апавядаць пра мінулае, пра сваё жыццё.

— Як вы вялі барацьбу ў падполы з самаўладствам? — пыталіся яны ў старой большэвічкі Свярдлоў: — Як ваявалі з Калчаком, Дзянікіным?

— А чому вас за рэволюцыйную работу паліцыя засылала ў Сібір? Я-б зараз сам не адмовіўся туды паехаць, там-жа так цікава... Кузбас, Магнітагорск, Ангара...

Пісьменнікам рахункам прад'явілі:

— Чаму вы не пішыце аб нашым будаўніцтве мастацка, глыбока і коратка?

Да працы і ў перапынку тут вядуць дыскусію па пастаноўцы «Коварство и любовь» Любяць чытаць творы Горкага, Чэхава, Пушкіна, Тургенева і іншых класікаў. Чытаюць і беларускіх пісьменнікаў, як Лынькова, Александровіча, Галавача.

У гэтых цэхах рыхтуюцца кваліфікаваныя рабочыя швейнай прамысловасці. Гэта ім, будучым ударнікам швейных фабрык Совецкай Беларусі, хочацца ведаць, як працуе совецкі пісьменнік. Каб даць пісьменніку свае парады ў яго творчай рабоце, яны будуць праводзіць канферэнцыі чытачоў. Маладыя ўдарны калектыў менскай школы швейнікаў фабрычна-заводскага вучнёўства па праву носіць ганаровую назву «КІМ».

Большасць з іх нарадзілася разам з Кастрычніцкай рэволюцыяй, разам з Ленінскім комсамолам. На ногі яны цвёрда сталі, калі краіна залячыла раны рукамі іх бацькоў ад шарадаў аку паитаў. Ім невядомы нават гады грамадзянскай вайны і геройскія ўчынкі першых узброеных комсамольскіх атрадаў, якія ішлі пад кіраўніцтвам партыі на барацьбу з белай зграяй. Яны гэта ведаюць толькі па запамяданных, па баявых песнях. Яны растуць і мацнеюць разам з ростам бацькаўшчыны пролетарыята. Іх біяграфія —гэта біяграфія краіны, упарта будуючай социялізм.

І вось зараз за швейнымі машынамі, пад лявучы гуд матораў, яны штодзень на авалодваюць мастацтвам шыць вопраткі рабочаму і калгаснику. Справа вельмі адказная — задаволіць зараз тут з кожным днём культурна ўзрастаючага спажыўца. Паспрабуй пашыць па густу, не вучыўшыся.

У пучобе калектыву ФЗВ імя КІМ дабіўся таго, што пераробкі зведзены да мінімума. Некаторыя брыгады, як брыгада Мільчака, у якой працуюць лепшыя ўдарніцы якасці **Мельнікава, Бубнова, Бацюкова, Скрыдпеўская, Альноўская, Кануш, Харытончык,** зусім іх не маюць. А гэта многа значыць. Яны могуць самастойна зараз працаваць. У гэтым годзе ФЗВ выпусціла ўжо 250 кваліфікаваных рабочых-швейнікаў.

Сістэматычна працуюць два тэхгурткі па павышэнні кваліфікацыі—250 чалавек рыхтуюцца трымаць тэхэкзамен. У 7 палітгуртках грунтоўна прапрацоўваюцца палітычныя пытанні. Усё вучнёўства ахоплена вайсковай вучобай, праводзіцца конкурс на лепшага стралка.

— У інтэрнатах у нас з масавай работай справа стаіць кепска, — дакладвае сакратар комсамольскага калектыва **Гольдзін:** — Арганізавалі бытавую камуну, паладзілі шкаляні калектыў

ТАТУР — дэлегат 8-га ўрачыстага пленума ЦК ЛКСМБ.

ных наведванняў тэатраў і кіно. На днях праводзім канферэнцыю чытачоў, думаем арганізаваць літаратурны дыскут, але ўсё-ж пры нашым упартым жаданні вучыцца і весела праводзіць вольны час — гэтага мала.

Так, гэтага мала! Тут, дзе іскрыцца ініцыятыва, неабходна смелая ініцыятыва, каб задаволіць вялікія запатрабаванні маладосці.

М. ВІШНЕЎСКІ.

Тав. БАРЫСАВЕЦ — комсамолец-ударнік—калгаснік Слуцкага раёна.



Комсамольскі паравоз «Э-17». У авале ўдарная комсамольская брыгада дэпо Віцебск. Злева направа т. т.: ПАНУШКІН—пам. машыніста, ЧАРНЯК —качагар, Кавалёў—качагар.

Гэты жыццёвы шлях складаецца з тысяч геройскіх учынкаў, імі пад кіраўніцтвам партыі Леніна здзяйнала самаадданая гераічная барацьба маладых пакаленняў на франтах грамадзянскай вайны і сацыялістычнага будаўніцтва.

I.

Увесь час, усю гісторыю да барацьбы працоўная моладзь, арганізаваная пад знамем ленінскага комсамола, пераносіла на гаспадарчы фронт, на барацьбу за выкананне гаспадарчапалітычных задач, пастаўленых партыяй.

Ленінскі комсамол БССР — сустаўная частка шматмільённага комсамола—ушэсаў у пятнаццацігадовую гісторыю УсеЛКСМ не адну гераічную старонку барацьбы з акупантамі, удзела у партызанскіх атрадах. ЛКСМБ актыўна і ладна дапамагаў і дапамагае партыі ў індустрыялізацыі Совецкай Беларусі, у калектывізацыі сельскай гаспадаркі, у барацьбе за развіццё культуры, нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зместу. І толькі большэвіцкаму кіраўніцтву камуністычнай партыі абавязан ЛКСМБ гэтымі дасягненнямі.

Комсамол сустракае сваё пятнаццацігоддзе ўдзямам вытворчай ініцыятывы, рапартуе Цэнтральнаму Камітэту партыі і Цэнтральнаму Камітэту комсамола масавымі вытворчымі паляраміямі.

Комсамольцы калектыва БелДРЭС у парадку выканання абавязкаў, узятых на сябе ў часе падрыхтоўкі да юбілея, адрамантавалі у нерабочы час такарны станок. Комсамольцы арганізавалі суботнік на вытвараснай гаспадарцы ў карысць ленінскай авіяэскадрыльі імя X з'езда ЛКСМБ. Па ініцыятыве комсамольскай арганізацыі пачаўся конкурс на лепшае «бедуючае» рабочых. Змагаючыся за выкананне пасці умоў тав. Сталіна, комсамольская арганізацыя пачынае барацьбу за такія пытанні, як паверка таго, наколькі пад рыхтаваны статары рабочых да зімы, як сакрэтарыят гарадзкіна і інш. Рэйд па гэтаму пытанню праводзіць «лёгкая кавалерыя» БелДРЭС'а.

З пачэсці вытворчым уздымам сустракаюць сваёй комсамольцы фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», фабрыкі, якая мела сур'ёзныя прарывы.

Моладзьная істужка імя совецкай спартакіяды выканала план першай паловы кастрычніка на 109,5 проц., істужка імя КІМ — 107,3 проц., імя X з'езда ЛКСМБ — 102,6 проц. У гэтых істужках і брыгадах працуюць не толькі комсамольцы, але і шмат беспартыйнай рабочай моладзі. Комсамольцы арганізавалі яе, узначалілі яе ініцыятыву, дамагліся выканання вытворчага плана і дастойна сустракаюць юбілей.

Комсамольцы **віцебскага трамвая** рапартавалі аб выкананні ўзятых абавязкаў: — праведзен комсамольскі суботнік і датэрмінова пушчана ў эксплаатацыю шырока-далёкая дарога віцебскага трамвая.

Можна прывесці яшчэ шмат фактаў такога-ж самага парадку.

Комсамольская брыгада тав. **Дарашэнка** (6 вагонны ўчастак менскага вуза) у падарунак 16-годдзю ЛКСМБ адрамантавала жыш плана 3 пасажырскіх вагоны. Комсамольцы **Чартоў, Якавец і Дарашэвіч сістэматычна перавыконваюць норму выпрацоўкі.**

Юбілей з'явіўся датай яшчэ большай мабілізацыі шырокіх мас комсамольцаў і працоўнай моладзі на ліквідацыю прарываў, на ўздым вытворчасці.

II.

Правадыр нашай партыі тав. **Сталін** сказаў: **«Пафас будаўніцтва мы павінны дапоўніць пафасам аўладання тэхнікай».** Комсамольцы, рабочая моладзь павінны паказаць узоры большэвіцкага аўладання тэхнікай.

ЦК УсеЛКСМ заклікаў «усіх маладых пролетарыяў Совецкага Саюза адзначыць пятнаццацігоддзе УсеЛКСМ выкананнем абавязкаў па аўладанні тэхнікай». Барацьба за аўладанне тэхнікай, барацьба за здачу норм па тэхнічнаму мінімуму кожным маладым рабочым ёсць неадкладная асноўная частка ўсёй вытворчай работы комсамола.

Уся практыкаванасць, цямлівасць, рухомасць маладой думкі накіравана на тое, каб аўладаць вышынямі індустрыяльнай культуры.

Зараз гэтага партыя патрабуе ад сваёй змены.

Комсамольцы **завода імя Варашылава** адзначаюць юбілей узмацненнем тэхнічнай вучобы. Да юбілея комсамольская арганізацыя завода праводзіць тэх экзамен першай дзесяткі комсамольцаў, ужо аўладаўшых тэхмінімумам.

Вось прыклады таго, якіх надзвычайных вынікаў дасягнуць комсамольцы ў гэтай галіне.

На фанерным заводзе **«Звязда» (Віцебск)** у ліпені месяцы ўстаноўлен лучэчны варштат навейшай замежнай сістэмы «Ролер» на выпуску экспартнай фанеры. Ні адзін рабочы на заводзе не мог працаваць на гэтым варштаце. Комсамолец **Коцін** задаўся мэтай авоіць тэхніку лучэчнага варштата. Упартай напружанай работай над кіраўніцтвам бялынера Коціна вывучыў варштат і здаў тэхэкзамен на «добра».

Комсамолец **Пухавіцкі** на магілёўскім заводзе **«Чырвоны адраджэнец»** разам з групай маладых рабочых авоіў вытворчасць складаненькіх замежных мехаізмаў для пчаціпнай прамысловасці.

Святкаванне юбілея комсамола супадае з гадавінай узяцця шэфства комсамолам над ваенна-марскім флотам.

Флоцкі комсамол паказвае ўзоры баявой работы.

Вось што расказвае камісар лінкора тав. **Бакупін**, які прыехаў да сваіх шэфаў для ўдзела ў святкаванні юбілея:

— **Курт-Мамет** — малодшы камандзір электра-тэхнічнага дывізіёна. Яго аддзяленне мае 3-х комсамольцаў. Аддзяленне комсамольца Курт-Мамета не мае ні адной правіннасці. Норму баявой падрыхтоўкі аддзяленне здала на «добра».

—**Лук'янаў** — малодшы камандзір машыннай групы — служыць узорам для ўсіх байцоў.

— Узоры ў большэвіцкім аўладанні тэхнікай паказваюць комсамольцы ячэйкі машыннай групы. У гэтай ячэйцы 16 лепшых комсамольцаў арганізавалі тэхнічныя гурткі, дадатковыя тэхзаняткі. У выніку — **комсамольцы хутка дагналі «старыкоў». Добра авалодваюць складанай тэхнікай валоўных машын, самастойна стаяць на варце пры ўсіх механізмах.**

Расце маладое племя канструктароў, тварцоў новых, складанейшых у свеце механізмаў соцыялістычнай тэхнікі. Маладыя байцы-комсамольцы выходзяць **самастойна** на варту да самых адказных механізмаў.

Гэтых дасягненняў ленінскі комсамол пад кіраўніцтвам партыі дабіўся ўжо на першых кроках разгорнутага масавай барацьбы за аўладанне вышынямі індустрыяльнай культуры.

Ільіч пісаў: **«найгоршае мападых памочнікаў на час, месяц - два замясціць вышэйшыя пасады і будзе ўпэўнены, што пры зусім нязначнай страце для справы ў апошнім і цэлым справа пра шэнна выйграе... Час вазны, моладзь вырашыць выход барацьбы...»**

«Маладыя памочнікі» партыі — ленінскі комсамол, маючы блінкучую праграму — прамову Ільіча на III з'ездзе, пад кіраўніцтвам партыі і лепшага вучня Леніна — тав. Сталіна змагаецца за рэалізацыю гэтых указанняў. І ўжо зараз комсамол даў партыі, даў краіне інжынераў, тэхнікаў, рабочых, якія з вялікай карысцю для справы працуюць на фабрыках, заводах, у МТС.

III.

Вызначаючы характар саюза моладзі, тав. **Сталін** сказаў, што комсамол з'яўляецца свабодная арганізацыя, якая яднае маладых рабочых і сялян. Але, — падкрэсліваў тав. Сталін, — «необходна кіруючую ролю ў комсамоле забяспечыць да пролетарскім элементам.

Комсамол працабіў вялікую работу па выкананні гэтага ўказання тав. Сталіна. Праведзен рад мабілізацый на работу ў вёску. У парадку выканання гэтага ўказання т. Сталіна, ЦК ЛКСМБ накіраваў для работы ў калгасы БССР 600 лепшых комсамольцаў-ударнікаў з вытворчасці.

Матарылы завочнай нарады шасцісотнікаў, якую зараз праводзіць ЦК ЛКСМБ на старонках **«Чырвонай змены»**, паказваюць, якія ўзоры ў арганізацыі шырокіх мас калгаснага комсамола і беспартыйнай калгаснай моладзі на барацьбу за выкананне гаспадарча-палітычных задач паказалі яны на практычнай рабоце. Шасцісотнікі — прадстаўнікі пролетарскіх арганізацый саюза ў калгаснай вёсцы — паказалі сябе, як лепшыя дапаможнікі партыі ў вялікай рабоце па большэвізацыі калгасаў, за заможнае жыццё калгаснікаў.

***

Сваё пятнаццацігоддзе ленінскі комсамол адзначае вялікімі перамогамі на ўсіх франтах соцыялістычнага будаўніцтва. Гэтымі перамогамі комсамол абавязан толькі кіраўніцтву партыі.

Ленінскі комсамол на гэтым не спыняецца. **Юбілей — дата мабілізацыі.**

Яшчэ больш згуртаваўшы свае рады, рашуча ачышчаючыся ад усіх прымазаўшыхся, перараджэнцаў, змагаючыся за большэвізацыю сваіх радоў, ЛКСМБ пад кіраўніцтвам партыі аддасць усе свае сілы на далейшае развіццё народнай гаспадаркі БССР.

І. ШАПІРА.

ТАВ. МІКОШЧА—ФАРМАЎШЧЫК СКЛАДАНЫХ ДЭТАЛЯЙ ЗАВ. «КОМІНТЭРН» (ВІЦЕБСК) ВЫКОНВАЕ СВОЙ ПРАМФІНПЛАН.

ПЯТРУСЬ БРОЎКА

Сходка на рэчцы)*

(Урывак з паэмы)

Цяпер ужо шалёны.
Вечер хопіць
прасцай.
Сонца рыпімаюць
ціхай пар'яцкі
шум...
Сцяна нагодка
ў чоўне прагуляцца.
Ціхіна чортам лезе
Проста ў душу.
Хо-ж такой часінай
Ці цяпер
пагасцца?
Хіба вечы на ложак
Заклікуць стаць.
Ціхай-ка, чортаў вецер,
Ціхінай
да сэрца!
Комсамол хлопцы
Ідуць пагуляць.
Хай бушуюць бярэзі
У росчыне
прутлім,
І ад тонкіх песень
Ірвуцца
талава.
Хай там за фіранкамі
Пятуць
гімназісткі.
Ка-ка ў буру злую
Чэўка
падавай.

Дзе-ж вальной паравіцца?
Дзе-ж вальней
сустрэцца?
Гэткая нагодка
На вадзе
на яць!
Адплывае човен
Па труслівай рэчцы
Іх пяцёх
сабралася
У чоўне пагуляць.
І бунтуюць хвалі
Снежавого пенай,
Толькі хвалям
вёсел
Іншых не стрымаць!
Застаецца горад
У імжы
асенняй,
Сіратліва трубы
У шкрані стаяць.
І жоко голем ходзіць
Апалітаны
вецер.
Больш нясцерпна твары
Расплкае
золь.
Першым ўзпаўся Цукер: *)
«Хлопцы, паглядзіце!
Быццам мы смяемся,
А па сэрцы
боль.
Мы цяпер далёка
Адплылі
ад згубы.
Хлопцы, досыць смеху!
Будзем гаварыць!
Толькі знайце
тайну,
Каб знялелі
губы.
Мы-ж для калектыва
З гэтае пары.
Добра, што пасцелі
Сёння тут
сабрацца.
Маю я на мэце
Вам паведаміць —
Партыя ў падполлі
Разгарнула працу,
Мы-ж павінны партыі
У працы
пасабіць.
На змаганне клікаць
Маладых
рабочых —
Супроць акупантаў,
Супроць ўсіх панаў...
І гарэлі
ў хлопцаў
Апілыя вочы,
І кіпела ў грудзях
Маладая яроў.
— Знайце-ж
канспірацыю...
І працуйце спісла...
Каб ні слова
гэдам...
Паваджэш калі...
І, здасцца,
з вотрам
Вылятала Свіслач
Буйнаю паводкай
Мчала
на калі...
Будзе ў нас
патроба
Мы абзаведзем зноўку.
А цяпер за працу
Як мага раней...
Трэба йсці ў масы.
Працаваць
на тройках.
Яўка на кватэры
Будзе
у мяне.
Мы-ж павінны
ведаць —
Перамога скора.
Хупка
нашай зоркай
Загарыцца свет...
Пасядаў на чоўне
Сярод хваль
суровых
Першы у падполлі
Менскі камітэт.
І гарэў ў гамонцы
Там адзін,
другі...
Вырасталі плечы
Пад кашуляй
мужкай,
Быццам уставалі
Гнеўна берагі
І грымелі скалы
У раёгоне
гулкім.
Нарастала
бура,
Стала ў чоўне
цесна.
Як стрымаць, не знаўшы,
Пачуццё сваё,
Соня Зак сказала:
— «Хлопцы, дайце
песню,
Хоць на ціхі голас
Песню запяем!»
Сяўчык
быццам толькі
Гэтага чакаў,
З вотрам усхапіўся
Песняй маладой.
І тады
знямела
Гнеўная рака,
Песня палянцела,
Пакрыла
вадой.
Быццам
загаруўся
Сонцавейны ранак.
Сілы гаманілі,
Узнімаўся дух:
— Паўстань пракляцтвем
каталаны,
Паўстань,
хто з голаду
Вык пух...
Ружавелі
твары,
Як чырвоны мак
І яснела
ў полі
Дзікая нагода.
Ён узляцеў як сокал,
Нам сусветны
шарм.
На прасторы
ўзвіўся,
Як сімвал свабоды.
Ён на горад ачаўся,
Ён ляцеў
па вёсцы —
Дзе бізун жандара,
Дзе расстрэл
і здзек...
То співаў на чоўне
Сэрцам комсамольскім —
Першы
у падполлі
Менскі камітэт.
Комсамол
не знае
Ні тугі, ні суму,
Комсамольскім сэрцам
Ў сцюжу
не астыць.
Цукер пеў з хлапцамі
І лящелі думы,
Несцо там, за Менскам,
Дзе стаяць
франты —
Армія Чырвоная —
Першая
у свеце
Вышла на астачы
І рашучы бой, —
Б'ецца комсамольцы,
Чырвонаармейцы,
Б'ецца ўся рэспубліка
І гарыць
ярыўёй.
Яны знаюць
добра —
Перамога блізка.
Яны йдуць наперад
З агнявым
штыхом —
У лясах бясконцых,
У тайзе сібірскай
Б'ецца комсамольцы
З гадам
Калчаком.
Розныя палкоўнікі
Палящелі
хмарай,
Кожнаму ўладання
Дай кавалак свой.
Б'ецца-ж мілёны
З імі
пролетараў,
Б'ецца ўся рэспубліка
І гарыць
ярыўёй.
Тут-ка з лаокі божай
Край ўвесь
разбурылі.
І з-пад ласкі панскай
Весялыя
сыніць.
Трэба так
ў падполлі
Ім абрэзаць
крылы.
Потым каб адпойчы
Ворага дабіць.
На касцях
спраўдзю
Вораг тут вясёлае.
Кінцюры
за горла,
Да прудзей усцёс...
Цукер пеў з хлапцамі,
Думы ўслед ляцелі
Па усёй краіне,
Змучанай да слёз.
Човен плыў на горад.
Ужо касцёл
затрыцкаў
Пачалі кварталы
З-за імжы ясней.
Соня Зак
сказала:
— «Замяняй пласцінку,
Пачынай «Каробачку»,
Будзе
скакайней»
Човен розаў
квал
Вострым носам
шпарка.
Грай

Адкрылася Ленінградская с.-г. выстаўка

САКРАТАРУ ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО

У ДЗЕНЬ АДКРЫЦЦЯ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЙ ЛЯОНОЙ І РЫБНАЙ ВЫСТАВКІ ЛЕНІНГРАДСКАЙ, ЗАХОДНЯЙ АБЛАСЦЕЙ І БССР, УДАРНІКІ ГОРАДА ЛЕНІНА, ЛЕНІНГРАДСКАЙ І ЗАХОДНЯЙ АБЛАСЦЕЙ ШЛЮЦЬ ТАВЕ КІРАЎНІКУ БРАЦКАЙ НАМ РЭСПУБЛІКІ, БОЛЬШЭВІЦКАЕ ПРЫВІТАННЕ.

ТЫСЯЧЫ ПРАЦОЎНЫХ НА ЖЫВЫМ НАГЛЯДНЫМ ПАКАЗЕ ПЕРАКАНАЛІСЯ, ЯКІЯ ВЯЛІЗАРНЫЯ ПОСПЕХАЎ ДАВІЛІСЯ КАЛГАСНІКІ БЕЛАРУСІ У СПРАВЕ АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ ЛОЗУНГА ПРАВАДЫРА НАШАЙ ПАРТЫІ ТАВ. СТАЛІНА АБ ПЕРАТВАРЭННІ ЎСІХ КАЛГАСАЎ У БОЛЬШЭВІЦКІЯ, А КАЛГАСНІКАЎ У ЗАМОЖНЫХ.

ШЧАСЛІВАЕ ЖЫВЕ СПРАВА ЛЕНІНА І СТАЛІНА!

ШЧАСЛІВАЕ ПЕРАМОЖНЫ КАЛГАСНЫ ЛАД!

ШЧАСЛІВАЕ І МАЦНЕЕ БРАЦКАЯ НАМ РЭСПУБЛІКА — БССР.

Па даручэнню абласных совецкіх і партыйных арганізацый удзельнікаў урачыстага сходу па адкрыццю выстаўкі:

ЗАГ. ЛЕНІНГРАДСКІМ ОБЛЗУ **СМІРНОЎ.**

ДЫРЭКТАР ДЗЯРЖАЎНАГА МУЗЕЯ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ С.-Г. **ВЕРШЫНІН.**

У ЦК КП(б)Б

Аб падрыхтоўцы кадраў трактарных механікаў, брыгадзіраў і трактарыстаў

У мэтах забеспячэння добраякаснай падрыхтоўкі кадраў трактарных механікаў, брыгадзіраў і трактарыстаў, ЦК КП(б)Б пастанавіў:

Лічыць лепшую практыку падрыхтоўкі кадраў механікаў, брыгадзіраў праз кароткатэрміновыя курсы, а арганізацыю стацыянарных школ на падрыхтоўцы заканчэнняў у Слуцку на 160 чал., Рэчыцове — 200 чал., Гарадоцкім тэхнікуме механізацыі сельскай гаспадаркі на 60 чал., Сянно — 60 чал., саўгас «Ушачы» — 60 чал., саўгас «Дашуковка» — 20 чал. і саўгас «Закружжа» — 20 чал.

Тэрміны навучання ў школе механікаў устанавіць адзін год, а ў школе трактарных брыгадзіраў 8 месяцаў. Адказнасць за арганізацыю работы школ ускласці на Наркамзем, на райкомы партыі — Слуцкі, Рагачоўскі, Гарадоцкі, Сенненскі, Магілеўскі, Віцебскі, Полацкі.

Для падрыхтоўкі трактарыстаў пастаноўлена арганізаваць пастаянна дзейнічаючыя чатырохмесячныя курсы трактарыстаў пры кожнай МТС з такім разлікам, каб у зімовы перыяд 1933-34 г. падрыхтаваць 4.010 трактарыстаў.

Адказнасць за арганізацыю і правядзенне курсаў ускласці на дырэктароў трактарадэпёраў т. т. **Грабенчыка, Селіванава і Петрашкевіча,** нач. палітаддзелаў і дырэктароў МТС.

У школы трактарных механікаў, брыгадзіраў і трактарыстаў павінны прымацца правераныя на рабоце лепшыя калгаснікі-ўдарнікі, комуністы, комсамольцы, беспартыйныя актыву. Адбіраць слухачоў у школу мандатная камісія пад старшынёй начальніка палітаддзела МТС, саўгаса з удзелам прадстаўніка РК КП(б)Б, Наркамзема, райвыканкома і загадчыка школы.

ПАКОНЧЫЦЬ З БЕЗАДКАЗНЫМІ АДНОСІНАМІ ДА СКАРЫСТАННЯ ЧЫГУНАЧНАГА ТРАНСПАРТА

Чыгуначны транспарт БССР у асноўным зазнічыў перавозку бульбы і гародніны Ленінграду. Зараз пачаліся ўнутрырэспубліканскія перавозкі бульбы. Гэта тэхнічна больш складаны працэс, чым маршрутныя масавыя перавозкі ў адным напрамку. Тут патрабуецца вымоўная манеўранасць з забеспячэннем паражнякамі, з падборкай вагонаў пад пагрузку, з арганізацыяй пагрузачна-разгрузачных работ і інш.

Між тым, першыя дні пераключэння транспарта на ўнутрырэспубліканскія перавозкі паказалі некаторую супакоенасць як чыгуначных, так і загатоўчых арганізацый. Да станцый вепьмі маруд на падвозіцца бульба. Павялічыліся прастоі вагонаў (Хойнікі, Лепель, Жодзіна, Смаргоні і інш.). Кліентура абмяжоўваецца тым, што плоціць штрафы і нікому не клапоціцца аб тым, каб зніжаць прастоі вагонаў па іх віне.

Назіраецца масовае затрыманні вагонаў і пад выгрузкай. На радзе станцый бульба свяжчасова не выгружаецца і не вывозіцца з прычыны адсутнасці складаў і недахвата аўтагужтран спорта.

У Менску **БЕЛПЛОДГАРОДТРЭСТ,** не маючы куды выгружаць—бо склады ўсе перапоўнены—прыступіў да перавозкі вагонаў іншым арганізацыям. У выніку непрадуцыйны прабег вагонаў і лішняя прастоі. **МЕНЦЗРАБКААП,** не маючы складаў выгружае проста пад адкрытым небам, загружаючы прыбэйжную пляцоўку. Таго-ж становішча і з грузам **ГАРРАБКОПА.** Завод **«БОЛЬШЭВІК»** выдае рабочым бульбу проста з вагона, затрымліваючы іх да 15 гадзін. Падобных фактаў злачынных адносін да скарыстання вагонаў можна было-б прывесці значна больш. Калі так будзе працягвацца, дык прыдзецца проста ўжыць апошнія меры—абвясціць канвенцыю. Гэта значыць, спыніць перавозку грузаў у Менск.

Дапусціць гэтага ні ў якім разе нельга. Неабходна ўжыць рад сур'ёзных мер як па лініі транспарта, так і па лініі кліентуры. Кіраўніцтвы чыгуначных раёнаў павінны патрабаваць ад кліентуры балвой і выразнай работы. Падачу вагонаў трэба праводзіць толькі па адказных заяўках і пасля праверкі праз начальнікаў станцый, што пазначаная ў заяўцы колькасць бульбы сапраўды падвезена да станцыі. На месцах трэба мабілізаваць неабходную рабгужсілу і аўтатранспарт для хуткай арганізацыі пагрузачна-разгрузачных работ і для выяўлення чыгуначных складаў. Ужываючы закон аб штрафах за прастой вагонаў, трэба разам з тым прыцягваць да судовай адказнасці вінаватых.

Толькі выразная работа транспартных арганізацый і кліентуры, узаемная дзелавая спрацаванасць можа забяспечыць зніжэнне мапейшых прастояў, выкананне штосутачнай праграмы пагрузкі і выгрузкі.

Упэўнаважаны **ЦК і СНК па перавозках РАСКІН.**

Аб скл[illegible] з ячэйковых камісій па чыстцы Менскартарганізацыі

Пастанова Менскай гарадской камісіі па чыстцы КП(б)Б

Падтвердзіць ячэйковыя камісіі па чыстцы партарганізацый у наступным складзе:

а) На чыстцы ячэйкі Наркамсобаса: старшыня — **Арнд А. І.,** член партыі з 1919 года, рабочы, дырэктар Белдзіпрасобаса; члены: **Хайкін С. Н.,** член партыі з 1920 года, рабочы, нач. сектара мовных дзяцей галоўдартранса; **Шапешкаў І. Х.,** член партыі з 1924 г., рабочы завода «Большэвік».

б) На чыстцы ячэйкі ЦКК-НК РСІ: старшыня — **Гнілянскіч Н. П.,** член партыі з 1918 г., рабочы, член прэзідыума ЦКК КП(б)Б. Члены: **Рубін І. С.,** член навукі з 1925 года, рабочы, загучных крэдытных аддзелаў дружарні імя Сталіна; **Мінкусені З. Э.,** член партыі з 1926 г., рабочы, член ЦК КП(б)Б—старшыня завода «Большэвік».

в) На чыстцы ячэйкі ЦК КП(б)Б: старшыня—**Жоніч,** член партыі з 1915 г. рабочы, член прэзідыума ЦКК КП(б)Б, член Наркома РСІ БССР. Члены: **Жуковіч І. Ф.,** член партыі з 1918 года, рабочы, член ЦК КП(б)Б, Наркамгас; **Шыкайка С. С.,** член партыі з 1924 года, рабочы—талоўны механік друкарні імя Сталіна.

г) На чыстцы ячэйкі ВКСГПБ: старшыня—**Петрушкевіч В. Д.,** член партыі з 1918 года, служачы, начпалітаддзела ГУМ. Члены: **Варонін,** член партыі з 1918 г., служачы, кіраўнік с. г. групы ЦКК-НК РСІ; **Раксін Х. Д.,** член партыі з 1924 г., рабочы, загадчык сектара кадраў фабрыкі «8-е сакавіка».

д) На чыстцы рэдакцый газет «Рабочы», «Аксябр», «Чырвоная змена», «Калгаснік Беларусі», «Орка»: старшыня—**Клімковіч М. М.,** член партыі з 1920 года, служачы—старшыня саюза совецкіх пісьменнікаў. Члены: **Краснікаў Я. С.,** член партыі з 1925 г., рабочы, начальнік участка галоўдартранса; **Хсдас І. Э.,** член партыі з 1924 года, рабочы—мантэр фабрыкі «Аксябр».

Менская гарадская камісія па чыстцы КП(б)Б.

УСЕБЕЛАРУСКІ ПАХОД ЗА ВЫСОКАЯКАСНУЮ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЮ

ЗАКОНЧЫЦЬ РАМОНТ І БУДАЎНІЦТВА АБОР І СВІНАРНІКАЎ

ЦІ ВЕДАЕ ТРЭСТ ДАРОГУ Ў САЎГАС?

За ўвесь час, як існуе палітаддзел у саўгасе **«Комсамольская праўда»** (Арцюшынскага) толькі адзін раз гаспадарку наведаў прадстаўнік аргпанскага Сім наводтраста.

Вось і ўсё «кіраўніцтва» трэста нашым саўгасам. Ніякіх канкрэтных указанняў, ніякай дапамогі ад трэста мы не бачылі. Між тым саўгас патрабуе тэрміновай дапамогі, асабліва ў справе забеспячэння свінога пагалоўя кармамі.

Калгасы, якія знаходзяцца бліжа ад саўгаса, возяць збожжа ў лік паставак на загатоўчы пункт. Саўгас «Комсамольская праўда» павінен па нараду атрымаць на пункце збожжа. З прычыны адсутнасці транспарта саўгас упэўнене перад трастам пытанне аб дазволе гэтым калгасам здаваць збожжа саўгасу ў лік абожжапаставак. Але нараду ўсё яшчэ няма. Саўгас корміць свіней пасенным аўсом. Свінні пачынаюць галадаць. І толькі пасля нашых настойлівых тэлеграм у ЦК КП(б)Б і Наркамсаўгас трэст прысылае нам нарад на адгрымане 30 тон карману на пункце, у 25-ці кіламетрах ад саўгаса.

17-га кастрычніка саўгас атрымлівае ад райземаддзела нарад на 20 тон аўса ў бліжэйшых сельсоветах. Здавалася-б, райземаддзел прапануе раней гэты авёс загатовіць.

Другі факт. Вялікае саўгас атрымаў 24-радковую інтэраўскую сэялку. У часе ўборкі мы атрымалі інтэраўскую спопелазалку. Але трактара нам не прысылалі. Аказалася, што трактар пасылалі ў другі саўгас, ды ўжо ёсць пасланы ў другі саўгас, ды ўжо ёсць два трактары. На ўсе нашы патрабаванні трэст адказвае толькі адно: «У вас ёсць палітаддзел, ён і пойдзе выхадзе». У выніку гэтага ў саўгасе зрываецца план зябліва.

Трэці факт. Для адрамантавання свінарнікаў да зімы патрэбна шкло. Пасылаем у верасні нашага прадстаўніка ў Менск за шклом, але аказалася, што трэст «забыў» уключыць нас у рэспубліканскі шарад. Рамонт зрываецца. 11 кастрычніка ўпаўнаркамсаўгасаў БССР паведамляе, што трэсту запраўджана для нас 4 скрынкі шкла і 4 скрынкі цэлюлоіду. Нарэшце, атрымліваем ад трэста прапанову камандзіраваць чалавека ў Віцебск за атрымашнем шкла. Калі ка ў Віцебск за атрымашнем шкла. Калі ка ў Віцебск за атрымашнем шкла. Калі ка ў Віцебск, аказалася, што нам прапануюць дробненькія кавалкі разбітага люстэрнага шкла, якім зашклець свінарнікі нельга.

Чацвёрты факт. Толькі 19-га кастрычніка трэст у парадку цыркуляра прапануе нам пачаць падрыхтоўку да зімы з тым, каб усю працу закончыць да 25 кастрычніка. Ужо не гаворачы аб «тэмпах» работы трэста, мы павінны адзначыць, што ніякай канкрэтнай дапамогі ў гэтым напрамку нам трэст не аказвае.

Кватэры для рабочых адрамантаваны таксама толькі на 50 проц. На ўвесь рамонт трэст асігнаваў 300 руб. Гэта значыць, на рамонт кватэр, свінарнікаў, на пабудову новых 8-мі печак у іх, на пліту ў кухні і на пабелку свінарнікаў.

Пяты факт. Летась у саўгасе будавалі свінарнік, цэлітар, абору, стайні. Стаць толькі шыферы. Для скончэння ўсяго будаўніцтва трэба 6.000 руб. Пабудовы шпіць, да скончэння іх яшчэ не прыступілі. Не больш дапамагае нам трэст і ў справе пакладзівання ўзіка. Калі двух месяцаў таму назад саўгас прасіў дырэктара трэста тав. Асокерка прысласць нам вопытнага бухгалтара для ранкіці справаў саўгаса. Толькі 17-га кастрычніка ўпаўнаркамсаўгасаў БССР хаў галоўбух упаўнаркамсаўгасаў БССР з інструктарам для правядзення ранкіці.

Такіх фактаў можна было-б прывесці безумоўна значна больш. Саўгас знаходзіцца ўсяго толькі на аддалёнасці адной гадзіны язды ад трэста. Тым не менш, ніякай дапамогі ад трэста ён не атрымлівае.

Палітаддзел ужыў на месцы ўсе меры, каб з наяўнымі сродкамі скончыць рамонт свінарнікаў, абор, стайняў і кватэр для рабочых, падрыхтаваць жывёлу да зімоўкі, пачаць падвозку алгала на зімовы час. Але без дапамогі трэста саўгас ніяк не зможа справіцца.

Палітаддзел патрабуе ад трэста і ад раённых партыйных і совецкіх арганізацый сваім жывым кіраўніцтвам і ніякай сваім жывым кіраўніцтвам і ніякай сваім жывым кіраўніцтвам і ніякай патрэбнымі кадрамі дапамагчы саўгасу выбрацца з таго становішча, у якім ён зараз апынуўся.

Начальнік палітаддзела ТОКЕРАЎ.

ПА СВІНАРНІКАХ ГУЛЯЕ ВЕЦЕР

Калгасы **Чырвонаслабодскага** раёна толькі фармальна ўключыліся ў паход за высокаякасную жывёлагадоўлю. Са праўдзівай баявой работы па рамонту і будаўніцтву абор і свінарнікаў у раёне няма.

Вось некалькі фактаў, якія яркa малююць становішча на фермах калгасаў раёна.

У калгасе **«Воля»** праз дзіравую страху, як з вядра, свіней палівае дожджж, з усіх бакоў вее вецер.

Праўленне калгаса на чале са старшынёй Чаркасавым нічога не робіць для таго, каб адрамантаваць свінарнік.

Надзвычай дрэннае санітарнае становішча фермы. Бульбу для свіней мыюць ля самага ўваходу на кухню, брудная вада цячэ проста ў свінарнік, парасяты яе п'юць, а потым хварэюць. Праўда, не лепшую ваду п'юць свінні і са стулні, у якой столькі бруду, што ўжываць гэтую ваду проста шкодна.

На ферме працуе калгасніца **Алейчык,** якая вельмі мала цікавіцца калгаснымі свінямі. Тут-жа на ферме калгаснымі кармамі яна корміць сваіх уласных свіней і даглядаць калгасных свіней ёй «няма калі».

Возьмем калгас **«Нараджэнне сацыялізма».** Будаўніцтва свінафермы не скончана. Столі і вокнаў няма. У калідоры няма каллоті. Свінні стаяць у граязі, у цёмным памяшканні, што значна ўплывае на іх прадукцыйнасць. Тав. Салдаценка — загатчык свінафермы — некалькі разоў ставіў гэта пытанне на праўленні. Але дагэтуль нічога канкрэтнага не зроблена для паскарэння будаўніцтва свінарніка.

Не лепш і з падрыхтоўкай аборы да зімы. Абора дагэтуль не перагароджана на асобныя стайні. Усе 70 кароў у агульным стойле. Кармам няма дзе адпачыць, няма для іх карытушак, што значна зніжае ўдойлівасць.

Пра ўсё гэта добра ведае старшыня калгаса Храловіч, тым не менш аборы да зімы ён і не думае рыхтаваць.

У калгасах **«Анзор», «Комунар», «Чырвоная ніва»** летась пабудаваныя хлявы дагэтуль яшчэ без падлог. У калгасах **«Новы шлях», «12-годдзе», «Ільіч»** і інш. нічога не робіць для таго, каб скончыць распачатае сёлета будаўніцтва. Гэта значыць, што ў гэтых калгасах жывёла наўрад ці будзе мець сёлета цёплую зімоўку.

Не лепшае становішча і па пушчніцкіх фермах раёна. Узяць хоць-бы для прыкладу пушчніцкую ферму калгаса імя **Варашылава.**

Будаўніцтва пушчніка яшчэ не скончана. У памяшканні, дзе гусі зараз знаходзяцца, няма страхі, падлогі, вокнаў, не зроблены стойкі, і ўсе гусі корміцца разам. Склеп для сеўнай бульбы поўны вады, і бульбу нама куды падзець. Студня па ферме запылла чвырам, гніллю. Гусі п'юць гэту ваду, заражаюцца і хварэюць.

Прыведзеныя факты сігналізуюць аб тым, што ў нас у раёне справай соцыялістычнай жывёлагадоўлі яшчэ не зайняліся як след. Месяцнікам падрыхтоўкі жывёлы да зімоўкі ніхто не кіруе. Уся гэта справа кінута на самацёк.

Калі ў бліжэйшыя дні не будзе створан рашучы пералом, ёсць рэальная пагроза, што значная частка пагалоўя раёна застанецца зімаваць пад адкрытым небам.

Слабадскі.

ХОД ЗБОЖЖАПАСТАВАК НА 25 КАСТРЫЧНІКА 1933 ГОДА

(У ПРОЦАНТАХ ДА ГАДАВОГА ПЛАНА)

УСЯГО	САЎГАСЫ	НАТУРАПЛАТА МТС	ЗВАРОТ НАСЕННАЗЫКІ
86,2	77,3	61,3	61,2

План збожжапаставак яшчэ не выкананы. На 25 кастрычніка загатоўлена 188.036 тон збожжа, што складае 86,2 проц. Дзяржаве яшчэ недадана звыш 20 тыс. тон збожжа.

Што з'яўляецца асноўнымі прычынамі слабых тэмпаў збожжапаставак?

У першую чаргу—дэмабілізацыйныя настроі. Замест таго, каб напружыць усе сілы, мабілізаваць усе сродкі, каб неадкладна завяршыць пастаўкі, многія раённыя арганізацыі фактычна пусцілі справу на самацёк, спадзяючыся, відавочна, на тое, што «апошнія процанты набіруць свае сабой». Між тым у цэлым радзе раёнаў гэтыя «апошнія процанты» даходзяць да 30-35 і больш. Так **СЯРОЦІНСКІ** раён выканаў гадавы план толькі на 65,5 проц., **ЧАШНІЦКІ**—на 67,9 проц., **ЛЕЗНЕНСКІ**—на 67,7 проц., **СУРАЖСКІ**—на 68,5 проц., **УШАЦКІ**—на 68,8 проц., **МСЦІСЛАЎСКІ**—на 64,3 проц. і г. д.

Недапушчальна слаба паступае натураплата МТС. На 25-е кастрычніка план натураплаты МТС па рэспубліцы выкананы толькі на 61,3 проц. Ва многіх раёнах гэты процант яшчэ больш нізкі. Так, Бешанковіцкі раён, пры выкананні агульнага плана збожжапаставак на 87,3 проц., натураплату выканаў толькі на 27,3 проц. Лагойскі раён аднаведна—70,6 проц. і 29,6 проц., Суражскі раён—68,5 і 23,5 проц. і г. д.

Такое становішча абсалютна недапушчальна. Раённыя арганізацыі абавязаны мабілізаваць усе сілы на завяршэнне збожжапаставак да 1-га лістапада. Заваяваць права на ўдзел у Кастрычніцкіх святах у Менску — гонар кожнага калгаса. А гэта права можа быць заваявана толькі выкананнем усіх сельска-гаспадарчых кампаній і, у першую чаргу, збожжапаставак.

«Ад імя абласнога камітэта Заходняй комуны і абласнога камітэта РКП слова для прывітання атрымлівае тав. **Іваноў.**

«Зараз у новых умовах моладзь Беларусі можа разгарнуць свае крылы,—адзначае тав. Іваноў,—ёй прадаставіцца права арганізоўваць свае саюзы, якія будуць змагацца за вызваленне пролетарыята, аказваць дапамогу совецкай уладзе. І калі задачай моладзі ў мінулы час была барацьба з урадам буржуазіі, дык цяпер усе сілы революцыйнай моладзі павінны быць накіраваны для барацьбы з разрухай, якую выклікала 4-гадовая вайна.

«Слова для дакладу аб дзейнасці часовага абласнога камітэта атрымлівае тав. **Ахманаў.**

«Пасля невялікіх спрэчак і заключнага слова дакладчыка прынята наступная рэзалюцыя **аб усерасійскім з'ездзе:**

«Заходня-абласны з'езд торача вітае першы ўсерасійскі з'езд рэвалюцыйнай моладзі і далучаецца да ўсіх яго пастаноў, абавязваючыся прыклаўці ўсе сілы да правядзення іх у жыццё.

З'езд выказвае поўную ўпэўненасць, што ў недалёкім будучым рэвалюцыйная моладзь Расіі пашле сваіх прадстаўнікоў на міжнародны з'езд комуністычных саюзаў моладзі».

Гэты з'езд абраў абласны камітэт саюза, які праз месяц пасля вызвалення Беларусі ад нямецкай акупацыі пераехаў у Менск, рэарганізаваўшыся ў Цэнтральны камітэт комсамола Беларусі.

У снежні месяцы 1918 г., пасля прыходу Чырвонай арміі на Беларусь, у радзе гарадоў рэшкі акупаванай Беларусі арганізаваліся новыя комсамольскія арганізацыі.

Такім чынам толькі перамога Кастрычніцкай рэвалюцыі на Беларусі і ўстанаўленне совецкай улады ў канцы 1918 года адкрылі шлях для шырокага комуністычнага руху рабочай і сялянскай моладзі БССР.

Ударная работа комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі сярод працоўнай моладзі па яе арганізацыі і выхаванні, вялікі ідэйны ўплыў комуністычнага руху рабочай моладзі пролетарскіх цэнтраў Расіі—ўсё гэта адыграла рашаючую ролю ў арганізацыі і афармленні комуністычнага руху моладзі БССР.

Пад непасрэдным кіраўніцтвам і пры дапамозе партыі склаўся і афармізаваўся большэвіцкі маладняк—комсамол Беларусі.

ДА 1-га ЛІСТАПАДА ПОУНАСЦЮ ВЫКАНАЦЬ ПЛАН ПАСТАВАК БУЛЬБЫ

Уваравіцкія арганізацыі не змагаюцца з кулацкім сабатажам здачы бульбы

Ход абавязковых паставак бульбы

(на 25 кастрычніка ў процантах да гадавога плана)

Усяго загатоўлена	Здана калгасамі МТС	Інш. калгасамі	Аднаасобнікамі	Саўгасамі
69,7	82,7	79,7	55,8	61,7

Загатоўкі бульбы па БССР

(Па раёнах, на 25 кастрычніка ў проц. да гадавога плана)

1. Крычаўскі	99,2	35. Стародарожскі	75,3
2. Чэрыкаўскі	96,9	36. Старобінскі	75,2
3. Камарынскі	95,9	37. Брагінскі	74,6
4. Дрысенскі	93,1	38. Сяроцінскі	73,9
5. Гарадоцкі	92,0	39. Гсраўскі	73,7
6. Хойніцкі	90,7	40. Лёзненскі	73,2
7. Любаньскі	89,6	41. Суражскі	71,1
8. Чавускі	87,0	42. Бягомльскі	70,7
9. Тураўскі	86,9	43. Чачэрскі	69,8
10. Асвейскі	86,8	44. Бярэзінскі	68,5
11. Ушацкі	86,2	45. Кзоцюковіцкі	68,1
12. Смалявіцкі	84,1	46. Бабруйскі	68,0
13. Жыткавіцкі	83,7	47. Чашніцкі	67,2
14. Аршанскі	83,2	48. Ельскі	67,3
15. Нараўлянскі	81,4	49. Парыцкі	67,6
16. Пухавіцкі	81,4	50. Лагойскі	67,9
17. Слуцкі	81,1	51. Клічаўскі	66,8
18. Чырвонаслабодскі	80,3	52. Гомельскі	66,8
19. Капыльскі	79,2	53. Сенненскі	65,7
20. Расонскі	78,8	54. Дубровенскі	64,6
21. Асіпавіцкі	78,7	55. Карэлянскі	63,2
22. Чэрвеньскі	75,5	56. В.-Капалёўскі	63,0
23. Барысаўскі	78,1	57. Пятрыкоўскі	60,5
24. Лепельскі	78,1	58. Мазырскі	60,3
25. Віцебскі	78,0	59. Крупскі	58,6
26. Магілеўскі	77,9	60. Дзяржынскі	57,7
27. Менскі	77,4	61. Церахоўскі	57,2
28. Жлобінскі	77,8	62. Веткаўскі	56,6
29. Полацкі	77,5	63. Бешанковіцкі	55,5
30. Лельчыцкі	77,2	64. Уваравіцкі	55,0
31. Шклоўскі	77,1	65. Быхаўскі	54,1
32. Бельніцкі	77,0	66. Мсціслаўскі	53,6
33. Рагачоўскі	76,9	67. Прапойскі	51,9
34. Уздзенскі	75,9	68. Клімавіцкі	51,3
		69. Заслаўскі	50,7
		70. Рэчыцкі	50,6
		71. Лоеўскі	42,6
		72. Глускі	42,1
		73. Талачынскі	40,4
		74. Плешчаніцкі	35,6
		75. Чырвонапольскі	33,3

Кулацкая стаўка на „вымачку"

УВАРАВІЧЫ. (Наш. кар.). 1 лістапада—апошні тэрмін выканання плана паставак бульбы. Здавалася-б, раённае кіраўніцтва павінна было мабілізаваць усе сілы і сродкі, каб ажыццявіць пастанову ЦК КП(б)Б аб тэрмінах завяршэння асноўных сельска-гаспадарчых работ.

Але кіраўнікі Уваравіцкага раёна не вынеслі ўрокаў з пастановы ЦК. Раён з пяцідзённі ў пяцідзённку зрывае здачу бульбы. На 25 кастрычніка раённы план паставак выкапаў на 85,5 проц.

Есць сельсоветы, як напрыклад, Пляшчаніцкі, Лапіцкі, Калінінскі, Борхаўскі і Глазаўскі, якія ўвесь час адстаюць, выкананушы менш 25 проц. задання.

Ці прынялі раённыя арганізацыі рашучыя меры супроць зрыўшчыкаў паставак? Не! Яны фактычна падтрымоўваюць сабатажнікам.

Паводле пастановы СНК, дана адтэрміноўка па здачы бульбы да 1934 года тым калгасам і сельсоветам, дзе бульба вымакла і не ўраджэйная.

Старшыня РВК тав. **КАРАЛЕНКА,** замест таго, каб папулярызаваць, растлумачыць гэту пастанову, склаў табліцу, паводле якой не ўсім, хто палічан атрымаць адтэрміноўку, Караленка абмежаваўся фармальным абвяшчэннем аб гэтым на пасяджэнні бюро РК сумесна з прэзідыумам РВК, дзе былі таксама старшыні сельсоветаў, калгасаў і сакратары ячэек.

Кулакі шырока скарысталі адсутнасць масавай работы вакол пастановы аб скідках. Яны развялі агітацыю, што «раз даюць адтэрміноўку, дык можна ще спіцца са здачай».

Першым спыніў здачу бульбы старшыня **Плячанскага сельсовета Максімчыка,** які выканаў 10 проц. плана.

Гэтаму сельсовету дазволена адтэрміноўваць здачу толькі 40 тон. Максімчыка не задаволіўся гэтым, ён абышоў усе калгасы і шукаў «шацярнеўных» ад вымачкі. Зразумела, што знайшлося шмат жадаючых атрымаць адтэрміноўку. Наогул па Пячанскім сельсавеце загатоўкі застылі на мёртвым пункце.

Ад гэтага зрыўшчыка паставак недалёка адышоў і старшыня калгаса «Рухавік» **АЎГУЛЬ.** Ён падаў заяву ўпаўнаважанаму СНК па загатоўках, каб яму далі адтэрміноўку па здачы бульбы ў памерах 300 тон. Калгасу трэба здаць 282 тоны, прычым план выкананы толькі на 10 проц.

Старшыня **Рудзянеўскага** сельсовета член партыі **ВАСЯЛЬЦОЎ** распарадзіўся спыніць загатоўкі бульбы, бо «будуць даваць адтэрміноўку».

Старшыня Калінінскага сельсовета таксама згарнуў загатоўчую работу. На гэтым сельсавеце за апошнія тыдні не здана ні аднаго кілаграма.

Старшыня Чабаталінскага сельсовета **Кухэрэнка** зусім апусціў рукі, бо не бачыць таго, што рад праўленняў калгасаў і членаў сельсавета сабатуюць здачу прадукцыі дзяржаве.

Раённыя арганізацыі павінны заразжа мабілізаваць масы на барацьбу з кулацкім сабатажам паставак, шырока растлумачыць сапраўдную сутнасць адтэрміноўкі здачы прадукцыі. Зрыўшчыкі паставак павінны быць прыцягнуты да адказнасці.

Некалькі слоў аб апараце зрыўшчыкаў пунктаў. Раённая кантора Белплодгародніны адкрыла дзверы пунктаў розным злачынцам і чужым элементам. Загатчыкам пункта на ст. Будда-Капалёва працуе нейкі **ГАРЭЛІК,** які сістэматычна абманвае і ашуквае здатчыкаў, які перадае ашукаў калгас імя. Будзённага на 100 кіло бульбы.

Яго прыкладу следуе ватаўшчык **Хільневіч.** Апошні падаўна абманыў на 1,5 центнера сялян Забалоцкага сельсовета Купрышанкавых. Ціпа і Архіла. Хільневіч іншолі не паказвае сялянам, колькі важыць бульба. Ён лагаварыўся з грузчыкамі, каб яны хутчэй скідвалі мяшкі з ваг і высыпалі бульбу на зямлю. На пункце пануе круглая парука — адзін злачынца прыкрывае другога.

А. КАЗІМІРАЎ.

ЗАРАДЖЭННЕ КОМСАМОЛА НА БЕЛАРУСІ

Дакутовіч

Гісторыя ленінскага комсамола непарыўна звязана з гісторыяй партыі, з гісторыяй Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Партыя Леніна — арганізатар і кіраўнік Кастрычніцкай рэвалюцыі, на сваім VII з'ездзе бярэ рашучы курс на пашырэнне і арганізацыю ўзбраення пролетарыяту.

Ці ніхто з'явіўся пістарчным з'ездам і ў аснову арганізацыі рэвалюцыйнай рабоча-сялянскай моладзі. На гэтым з'ездзе выносіцца спецыяльная пастанова аб стварэнні і разгортванні працы рэвалюцыйных моладзевых арганізацый.

23 верасня 1917 г. адбыўся з'езд саюзаў моладзі Масквы. Гэты з'езд адбыўся праз у дні падрыхтоўкі да Кастрычніка, пад непасрэдным ідэйным кіраўніцтвам партыі.

Гэтыя саюзы моладзі ўспінаналі і абмяркоўваліся не стыхійна. Арганізуючая роля ў аб'яднанні рэвалюцыйнай моладзі ў адзіную арганізацыю належала партыі.

Разгорнуты рух на Беларусі ў гэты час знаходзіўся ў асаблівым цяжкім умоўным. Бо і зразумела, бо Беларусь стала часу з'явілася плацдармам імперыялістычных баёў. У гэты пістарычны час мы бачым рэвалюцыйную ініцыятыву на баяшчастах класавай барацьбы.

**

Недахопы пролетарскай рэвалюцыі вырашыць самым мяцнае матэрыяльнае і прадукцыйнае становішча моладзі. Падлоткі, выкінутыя рабочыя, пачынаючы з 18 год, выкінуць усе правы грамадзянства.

Сялянская ўлада скарачае рабочы дзень спрэчкаў, уводзіць роўную аплату працы дарослых і дарослых рабочых, праводзіць практычныя мерапрыемствы па ліквідацыі моладзі, увядзіны дарожнае навучанне. Такім чынам, толькі Кастрычніцкая рэвалюцыя дала ўсе магчымасці моладзі для яе развіцця і росту палітычнай свядомасці. Шырока разгорнутая работа большэвіцкай партыі па арганізацыі рэвалюцыйнага руху моладзі дала моцны штурмшок да абгрунтавання у адзіную ўсесаюзную палітычную арганізацыю моладзі.

У трэе годзе адбываецца першы з'езд РКСМ. Гэты пістарычны год у гісторыі комсамола з'яўляецца годам кансалідацыі комуністычных сіл моладзі. Ад сілы звязаных паміж сабой гурткоў юнакі рэвалюцыйны рух пераходзіць на рэйкі масавай арганізацыі.

Першы ўсерасійскі з'езд саюза рабочай і сялянскай моладзі адбыўся ў Маскве ад кастрычніка — 4 лістапада 1918 года. На яго з'ехаліся 176 дэлегатаў, якія прадстаўлялі 22.100 чал. арганізаванай рабочай і сялянскай моладзі. 80 проц. дэлегатаў былі рабочыя і сяляне, што паказвае на пролетарскі склад саюзаў. З усіх дэлегатаў было 68 членаў партыі, 38 спачуваючых і 45 беспартыйных.

Рэзалюцыя па бягучаму моманту, адгалосна прынятая з'ездам па дакладу тав. **Яраслаўскага,** ясцім выразна гаварыла аб палітычным творы з'езда:

«Перны з'езд рэвалюцыйнай моладзі Расіі, заслухаўшы дакład па бягучаму моманту, выказвае сваю поўную салідарнасць з рабоча-сялянскай уладай у яе барацьбе за комунізм. Сусветная комар-рэвалюцыя, якая пачне на поўдні, знойдзе ў нашым асяродзіччы палены адпор. Увесь свой рэвалюцыйны пыл, усе свае маладыя сілы мы аддамо на барацьбу з ёю. Наш голас разносіцца над усёй зямлёй, склікаючы пад свой сцяг рэвалюцыйную моладзь усяго света. Наклікаецца апошні і рашучы бой. Ні крока назад!»

З'ездам былі прыняты з асноўных прынцыпаў юнацкага руху:

1) Саюз салідарны з РКП(б), саюз стаіць мэтай пашырэння ідэй комунізма і ўдзячнае рабочай і сялянскай моладзі ў актыўнае будаўніцтва совецкай рэспублікі.

2) Саюз з'яўляецца незалежнай арганізацыяй.

3) Саюз называецца «Расійскі комуністычны саюз моладзі».

Гэтыя асноўныя палажэнні ўвайшлі ў праграму саюза, прынятую з'ездам.

На першым усерасійскім з'ездзе ўсе рэвалюцыйныя арганізацыі моладзі Заходняй боўдасці былі прадстаўлены

ПРАЦЭС АБ ПАДПАЛЕ РЭЙХСТАГА

АБВІНАВАЧАННЕ ЦЕРПІЦЬ ПРАВАЛ ЗА ПРАВАЛАМ

ТОРГЛЕР І ДЗІМІТРАЎ МУЖНА ВЫКРЫВАЮЦЬ ФАШЫСЦКІХ СУДДЗЯЎ

ПАРЫЖ, 28. (БЕЛТА).

На ўчарашнім пасяджэнні суда па справе аб падпале рэйхстага, пасля таго, як былі заслуханы паказаньні «сведкі» абвінавачання капітан-сацыяліста дэпутата рэйхстага—Кройера, Торглер зрабіў наступную заяву:

«Я заяўляю, што ніколі, таксама і 27-га лютага, не бачыў чалавека па прозвішчу Ван-дэр-Люббе, ніколі з ім не гаварыў і наогул яго не ведаю.

Упершыню я ўбачыў Ван дэр-Люббе 28-га лютага ў 11 гадзін раніцы пры вочнай стаўцы з ім. Тое-ж адносіцца і да Папова, якога я ніколі не бачыў і з якім не гаварыў».

На гэта Кройер адказвае,—дарэчы ку ды менш упэўнена чым раней,—што ён усё-ж астаецца пры сваіх ранейшых паказаньнях. Ён заяўляе, што адзежу Ван дэр-Люббе, якую той насіў у дзень пажара, ён авісаць не можа, бо не разбіраецца ў кожах, аднак яму запомніўся колер валос Ван дэр-Люббе і яго рост.

Суд пераходзіць да допыта стэнаграфісткі рэйхстага Баўмгарт. Яна заяўляе, што ў чатыры гадзіны дня бачыла Торглера разам з Нейбауэрам у вестыбюлі рэйхстага. Яна гаварыла па тэлефону і праз шкло тэлефоннай будкі бачыла сядзячага ў крэсле добра знаёмага ёй комуністычнага дэпутата Нейбауэра, да якога ў хуткім часе падсеў Торглер.

З прычыны таго, што абоіх дэпутатаў яна ведае ўжо рад год, дык памылка, паводле яе слоў, зусім выключана. Такім чынам, паказаньні Баўмгарт пацьвярджаюць заяву Торглера, што ён сядзеў у вестыбюлі рэйхстага з Нейбауэрам, і кваічаткова абвяргаюць сцвярджэнне «сведак»—Карване, Фрэя і Кройера, што з ім нібыта сядзеў Папоў. Старшыня прабує пераадэчыць пытаньнямі пабудзіць сведку сказаць, што «яна магла памыліцца». Аднак, Баўмгарт катэгарычна паўтарае, што не магла прыняць Папова за Нейбауэра і пры гэтым падрабязна апісвае прыметы апошняга.

Затым у якасці сведкі дапытваецца комуністычны дэпутат Нейбауэр (знаходзіцца ў турэмным зьняволеньні). Нейбауэр заяўляе, што ў дзень пажара ён быў у рэйхстагу, дзе гаварыў з Торглерам і з буржуазным журналістам Оме.

З Торглерам ён сядзеў у вестыбюлі. На пытаньне, ці не памятае ён, на якой імённа капале, Нейбауэр адказаў: «падпал здарыўся 8 месяцаў назад. Да сёньня мяне ні разу не дапытвалі. Пасля столькіх пакут па працягу гэтага часу памяць працуе не так выразна. Я забыў амаль усе падрабязнасці гэтага дня».

На пытаньне пракурора Парызіуса Нейбауэр адказвае, што з часу падпала рэйхстага ён некалькі месяцаў скрываўся і быў арыштаваны толькі ў жніўні, з прычыны чаго не мог даць сваіх паказаньняў раней.

На пытаньне «абаронцы» Зака, ці можна прыняць працаваўпала ў комфракцыі студэнта Пэрля за Ван дэр-Люббе, як гэта ў пачатку працэса заявіў Торглер, Нейбауэр пасля вочнай стаўкі з Ван дэр-Люббе пацьвердзіў, што апошні сапраўды падобен на Пэрля і здалёк можна памыліцца. На пытаньне старшыні, аб чым Нейбауэр у той дзень раіўся з Торглерам, Нейбауэр указвае, што справа ішла аб адзіным фронце з соцыял-дэмакратамі. Такім чынам, Нейбауэр, які з дня падпала рэйхстага не бачыўся з Торглерам у турме і наогул быў зусім ізаляваны, пацьвердзіў паказаньні Торглера.

Затым старшыня, пракурор і «абаронцы» сумеснымі намаганнямі прабуюць з дапамогай пытаньняў сканструяваць версію, што компартыя падрыхтоўвала ўзброенае паўстаньне і арганізавала тэрарыстычныя акты.

На пытаньне старшыні Нейбауэр заяўляе:

«Комінтэрн перасцярагаў супроць тэрарыстычных актаў, а тэрарысты выключаліся з партыі. Выстаўлены ў мінулым годзе некаторымі комуністамі лозунг — «бі фашыстаў, дзе іх не сустрэнеш» — быў прызнан кіраўніцтвам германскай компартыі няправільным і шкодным. Компартыя самым рашучым чынам змагалася супроць тэндэнцый індывідуальнага тэрора. Уся работа была накіравана на арганізацыю масавых кампаній. Нашай мэтай была падрыхтоўка ўсеагульнай забастоўкі».

Дзімітраў задае Нейбауеру пытаньне: «Ці ставіла компартыя па падпала рэйхстага ў парадак дня задачу ўзброенай барацьбы за ўладу?»

Нейбауер:

Не. Усё палітычнае развіцьцё залежала ад таго, ці ўдасца стварыць адзіны фронт шырокіх рабочых мас супроць нацыянал-сацыялістаў».

Такім чынам, з усёй несумненнасцю ўстаноўлен той неабвержны факт, што Торглер і некаторыя члены комуністычнай парламэнцкай фракцыі назначылі на 28 лютага, г. зн. на другі дзень пасля пажара, дзелавыя нарады ў будынку рэйхстага.

З мэтай аслабіць уражанне ад паказаньняў Баўмгарт і Нейбауера выпускаецца рад «сведак» — служачых рэйхстага, якія зноў прабуюць адзіавіць версію, быццам Торглер сядзеў у вестыбюлі з Паповым.

Служачая Фельдман заяўляе, што ў гадзіну дня 27 лютага яна бачыла Торглера ў вестыбюлі рэйхстага жвава размаўляючым з кімсці. Калі яна падыйшла, Торглер нібыта спыніў гутарку. Фельдман таксама вымушана была прызнаць, што ў той дзень у вестыбюлі рэйхстага было цемнавата.

Наступны «сведка» — служачы соцыял-дэмакратычнай фракцыі рэйхстага — Дэншэль бачыў Торглера ў вестыбюлі ў 14 гадзін 30 мінут «здаецца з Паповым».

Аднак, нават старшыня вымушан указаць Дэншэлю, што ў першых яго паказаньнях ён гэтага не гаварыў. Пры вочнай стаўцы з Паповым Дэншэль яго, эразумела, «пазнае». Папоў зноў катэгарычна заяўляе, што ніколі не быў у рэйхстагу і не знаём ні з адным дэпутатам. Ён указвае таксама, што Дэншэль яго не пазнаў, калі яму паказалі фатаграфіі трох балгар. Апроч таго, Дэншэль гаварыў аб чырвона-карычневым пальто субяседніка Торглера. Ёнжа такога пальто ніколі не меў.

Дзімітраў указвае Дэншэлю, што яму трэба было 8 месяцаў, каб выявіць, што гэты Папоў быў таемны субяседнік Торглера.

«Дзіўна, — п. старшыня, — гаворыць Дзімітраў, — адкуль такое развіцьцё рэчаў. І гэта не ў першы раз. Сведка Горнеман таксама таму-сяму навучыўся толькі пасля».

Старшыня пытаецца сведкі, ці ўпішаў хто-небудзь на яго. Сведка, эразумела, адмаўляе гэта. Дзімітраў:

«Сведкае мае здзіўляючы талант: са спазненнем абуджаючуюся памяць».

Старшыня ў шаленстве пазбаўляе Дзімітрава слова за «наглыя заўвагі». Аднак, пад націскам публічнага выкрыцця яго (Дзімітравым Дэншэль вымушан затым адмовіцца ад сцвярджэньня, быццам Торглер сядзеў у той дзень у вестыбюлі рэйхстага з Паповым.

АБМЕН ТЭЛЕГРАМАМІ ПАМІЖ тав. ВАРАШЫЛАВЫМ і ІСМЕТ-ПАШОЙ і т. КАРАХАНАМ і ТЭФІК РУШЦЮ-БЕЕМ

АНКАРА, 27. (БЕЛТА).

Анаталійскае агенцтва паведамляе: «Старшыня совецкай дэлегацыі, народны камісар па ваенных і морскіх справах т. Варашылаў адправіў з парахода «Ізмір» наступную радыёграму:

«Наближаючыся да берагоў турэцкай рэспублікі, я шчасліў выказаць вам глыбокае задавальненне па повазу нашай бліжэйшай сустрэчы, якая, я ўпэўнены, паслужыць для яшчэ большага ўмацаваньня непахіснай дружбы нашых народаў. Я прашу вас прыняць мае шчырыя прывітаньні».

У адказ на гэту радыёграму старшыня совета міністраў Ісмет-Паша адказаў:

«Горача дзякую за прыязную радыёграму. Я асабліва шчасліў пры мысьлі, што заўтра я буду мець магчымасць прыняць вас у Анкары. Я таксама ад імя бока пераконан, што наша сустрэча паслужыць для яшчэ большага ўмацаваньня непарушнай дружбы, існуючай паміж абоімі краінамі. Калі ласка, просім! Мы будзем рады вітаць вас і ўсіх вашых паважаных спадарожнікаў на зямлі Турцыі, якая поўна радасці па повазу бліжэйшай сустрэчы. Я прашу вас прыняць выказваньні маёй самай шчырай дружбы».

Адначасова з гэтым намесьнік народнага камісара па замежных справах Карахан паслаў міністру замежных спраў Турцыі Тэфік-Рушцю наступную радыёграму:

«Я вельмі шчасліў, што буду мець магчымасць выказаць вам, дарагі міністр і друг, маю гарачую радасць па повазу маючага быць у хуткім часе пабачэньня і магу зноў пацьвердзіць вам свае запэўненні ў маіх самых сардэчных пачуцьцях».

Тэфік Рушцю-бей адказаў:

«З вялікім задавальненнем я атрымаў вашу радыёграму з парахода «Ізмір». Я вельмі расчулен вашымі такімі шчырымі і прыязнымі словамі. Я выказваю вам усю маю ўдзячнасць.

Я вітаю вас на турэцкай зямлі, якая будзе шчаслівa прыняць вас.

Я адчуваю радасць і глыбокае нецярпенне па повазу бліжэйшай сустрэчы з вамі, з народным камісарам па ваенных і морскіх справах Варашылавым і з усімі высока-паважанымі членамі дэлегацыі, пасланай вялікай прыязнай краінай».

Прабываньне совецкай дэлегацыі ў Турцыі

АНКАРА, 27. (БЕЛТА).

Анаталійскае агенцтва паведамляе: «Пасля невялікага адпачынку совецкая дэлегацыя ў поўным складзе наведала міністра замежных спраў Тэфік Рушцюбея, старшыню совета міністраў Ісмет-Пашу, старшыню нацыянальнага схода Кязім-Пашу і начальніка генеральнага штаба маршала Февзі-Пашу. Пры наведаньні начальніка генеральнага штаба совецкай дэлегацыі былі адданы вайсковыя ўшанаваньні. Затым совецкая дэлегацыя адправілася ў Анкара-Палас.

Пасля абмена афіцыяльнымі візітамі міністр замежных спраў Тэфік-Рушцюбей даў урачыстае сьнеданьне ў гонар совецкіх гасцей. На сьнеданьні прысутнічалі: старшыня совета міністраў Ісмет-Паша, міністр нацыянальнай абароны, міністр асветы, генеральны сакратар народнай партыі, таварыш міністра замежных спраў і паўпрэд СССР у Анкары Сурыц.

Анаталійскае агенцтва наладзіла ўрачыстае сьнеданьне ў гонар прыбыўшых прадстаўнікоў совецкага друку. На сьнеданьні прысутнічалі журналісты, дэпутаты і іншыя прадстаўнікі турэцкага друку».

***

АНКАРА, 27. (БЕЛТА).

Анаталійскае агенцтва паведамляе: «Прэзідэнт рэспублікі Газі Мустафа Кемаль-Паша сёньня ў 17 гадзін прыняў народнага камісара па ваенных і морскіх справах СССР Варашылава, намесьніка наркома замежных спраў Карахана, Бубнова, Кржыжаноўскага і Рудзённага. Гутарка цягнулася тры гадзіны. На прыёме прысутнічалі: міністр замежных спраў Тэфік Рушцю-бей, пасол СССР у Анкары Сурыц і турэцкі пасол у Маскве Хусейн-Рагіб-бей».

***

АНКАРА, 27. (БЕЛТА).

Анаталійскае агенцтва паведамляе: «Совецкая дэлегацыя на чале з народным камісарам па ваенных і морскіх справах Варашылавым у складзе намесьніка народнага камісара па замежных справах Карахана, наркома Бубнова, нам. наркома Кржыжаноўскага і чле на Рэвваенсовета Будзённага і асоб, якія іх суправаджаюць, прыбыла сёньня ў 10 гадзін 35 мінут спецыяльным цягнікам з Стамбула.

На адлегласці 50 клм. ад Анкары спецыяльны поезд, даставіўшы совецкіх гасцей, быў спатканы эскадрыльяй самалётаў.

На вакзале совецкую дэлегацыю сустрэлі: старшыня совета міністраў Ісмет-Паша, начальнік генеральнага штаба маршал Февзі-Паша, міністр нацыянальнай абароны і міністр асветы, камандзіры карпусоў і дывізій і рад іншых асоб.

Сустрэча совецкай дэлегацыі з прэм'ерам Ісмет Пашой і маршалам Февзі-Пашой была выклікана сардэчнай. Народны камісар Варашылаў націснуў руку Ісметы-пашы і заявіў, што ў яго асобе ён вітае турэцкі народ ад імя ўрада і народаў СССР. Націскаючы руку Февзі-пашы, Варашылаў заявіў, што ў яго асобе ён вітае благародную і пераможную турэцкую армію. У адказным слове Февзі-паша заявіў, што ў асобе Варашылава ён вітае благародную і найлепшую Чырвоную армію.

Затым народны камісар Варашылаў пад гукі «Інтэрнацыянала» прыняў парад турэцкіх часцей. Натоўп, які сабраўся на платформе і каля вакзала, наладзіў авацыю совецкай дэлегацыі. Вакзал і будынкі, якія прылягаюць да гасцініцы Анкара-Палас, упрыгожаны турэцкімі і совецкімі флагамі. Жонам гасцей былі паднесены кветкі. Дэлегацыя адправілася на аўтамабілях у Анкара-Палас, дзе для гасцей былі адведзены спецыяльныя апартаманты».

Напярэдадні XVI гадавіны Кастрычніка

МЕНСК.

* 6-га лістапада ў Доме культуры адбудзецца ЎРАЧЫСТЫ ПЛЕНУМ менскага совета разам з прадстаўнікамі партыйных, прафесіянальных, комсамольскіх арганізацый і Чырвонай армі, прысвечаны XVI-й гадавіне Кастрычніцкай рэволюцыі.

* 7-га лістапада адбудзецца АДКРЫЦЦЕ НОВАЙ ТРАМВАЙНАЙ ЛІНІІ на Кальварыю. Адкрыццё гэтай лініі звяжа трамвайнымі зносінамі цэнтр горада з вялікім рабочым раёнам, у якім знаходзіцца рад цагельняў.

* Заканчваецца ЗАБРУКАВАННЕ ЧЭРВЕНЬСКАГА ТРАКТА. Да кастрычніцкіх свят па гораду будзе насаджана 5.000 дрэў.

* У вітрынах дзяржаўных і кааперацыйных магазінаў у раёне Совецкай і Ленінскай вуліц арганізуецца ВЫСТАЎКА СЕЛЬСКА - ГАСПАДАРЧАЙ ПРАДУКЦЫІ КАЛГАСАЎ Менскага раёна. У вітрынах Ленінскай вуліцы арганізуецца выстаўка прамысловай прадукцыі 24 прадпрыемстваў.

* На лямцавай фабрыцы «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК» АДБЫЎСЯ ЗЛЁТ УДАРНІКАЎ ЯКАСЦІ. Многія ўдзельнікі злёта абавязаліся да 7-га лістапада выканаць 50 проц. квартальнага прамфінплана і гэтым заваяваць права на рапарт сакратару ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО. На фабрыцы разгорнута падрыхтоўка да сустрэчы зімы. Ацяпляюцца цэхі, рамонтуецца вентыляцыя. Праведзены суботнік па ачыстцы двара фабрыкі ад усякага смецця.

ГОМЕЛЬ.

* Ліцейны цэх ГОМСЕЛЬМАША ў гонар XVI гадавіны Кастрычніка рыхтуе рад вытворчых падарункаў. У Кастрычніцкія дні будуць пушчаны ПЕРШЫЯ ПЯЦЬ АГРЭГАТАЎ МЕХАНІЗАВАНАЙ ФАРМОЎКІ, пракладзена вузкакалейка для перавозкі зямлі і пушчана шчотка для механічнай абчысткі шасцёрак.

* Па-ўдарнаму рыхтуецца да гадавіны Кастрычніка ліцейны цэх завода імя ЛАНЦУЦКАГА. За першую палову кастрычніка план па чыгунным літці выкананы на 112 проц., брак зніжан да 0,5 проц., па бронзе план выкананы на 100 проц., брак зніжан да 2,1 проц. Рабочыя ліцейнага цэха абавязаліся адліць ЗВЫШ ПЛАНА дэталяй для паравоза і вагона.

Зборачны цэх завода імя Ланцуцкага ў падарунак XVI гадавіне Кастрычніка выпускае звыш плана ПАРАВОЗ, а вагонны цэх ДВА ВАГОНЫ.

* Брыгада 4-га акладчика 26 станцыі абвясціла сябе ЎДАРНАЙ ІМЯ XVI ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА і абавязалася поўнасцю закончыць змену шпал на другім галоўным шляху да 1-га лістапада. ВЫКЛІКАНЫ НА СПАБОРНІЦТВА ДРУГАЯ І ТРЭЦЯЯ БРЫГАДЫ.

* 2-га лістапада склікаецца ГАРАДСКІ ЗЛЁТ УДАРНІКАЎ ЯКАСЦІ.

* Майстэрні сувязі Гомельскага вузла ВЫПУСКАЮЦЬ ЗВЫШ ПЛАНА 4 БЛОК-АПАРАТЫ.

ВІЦЕБСК.

* Падрыхтоўка да кастрычніцкіх свят на фабрыцы «ДЗВІНА» праходзіць пад знакам барацьбы за стрыманне пераходнага сцяга гаркома КП(б)Б. Абвешчан унутрыфабрычны КОНКУРС НА ЛЕПШЫ ЦЭХ, БРЫГАДУ, РАБОЧАГА І РАБОТНІЦУ. У выніку конкурса рад брыгад выходзяць з адстаючых у перадавыя рады па выкананню прамфінплана. Так, напрыклад, брыгада імя гарсовета да конкурса выконвала прамфінплан на 99 проц., цяпер 102 проц., работніца БАРАНОЎСКАЯ адпаведна 95 проц. — 102 проц., работніца МАРЧАНКА адпаведна 100-110 проц.

* На ШЧАЦІННА - ШЧОТАЧНЫМ КАМБІНАЦЕ адбыўся ЗЛЁТ УДАРНІКАЎ. Злёт намеціў рад практычных мерапрыемстваў па паляпшэнню работы ўсяго камбіната. Конкурс, які праводзіцца па цэхах, узняў новую хвалю соцпаборніцтва і ўдарніцтва. Многія брыгады перавыконваюць свае вытворчыя заданні. Брыгада МІХАЙЛАВА (воласапрадзільны цэх) за першую дэкаду кастрычніка выканала прамфінплан на 130 проц., брыгада ІСХІЗАВА (шчаціннны цэх)—127 проц.

* 150 КАЛГАСНІКАЎ-УДАРНІКАЎ перадаюць калгасаў, якія паспяхова выканалі сельска-гаспадарчыя работы свае абавязкі па здачы с.-г. прадукцыі дзяржаве, прымуць удзел у кастрычніцкіх урачыстасцях у горадзе.

* 2 НОВЫЯ КІНО-ПЕРАСОЎКІ НАКІРОЎВАЮЦЦА Ў ПРЫГАРАДНЫЯ СЕЛЬСОВЕТЫ для культабслугоўвання калгаснікаў. Будуць прадэманстраваны фільмы, якія адлюструюць поспехі соцыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне за 16 год.

* На фабрыках «Сцяг індустрыялізацыі», «КІМ», імя Клары Цэткін і заводзе «Чырвоны металіст» АРГАНІЗАВАНЫ НОВЫЯ ГАСПАДАРЧА-РАЗРАХУНКОВЫЯ БРЫГАДЫ ІМЯ СТАСАВАЙ. На фабрыцы імя КЛАРЫ ЦЭТКІН брыгада імя Стасавай перавыконвае вытворчае заданне і выпускае найлепшую прадукцыю.

ЕЛЬСК.

У раёне арганізуецца выстаўка дасягненняў у сельскай гаспадарцы. На выстаўцы асаблівая ўвага будзе адданa паказу роста жывёлагадоўлі ў калгасах. Ад перадавых калгасаў ужо пачалі паступаць экспанаты. Адзін з лепшых калгасаў—імя Калініна—рыхтуе паказ становішча сваёй МТФ.

* У нямецкім сельсавеце імя Розы Люксембург ЗАКАНЧВАЕЦЦА ПАБУДОВА НОВАЙ ШКОЛЫ.

Фашызацыя Аўстрыі

ПРАГА, 28. (БЕЛТА).

Паводле вестак «Право ліду», у Берліне адбываюцца тайныя перагаворы паміж прадстаўнікамі аўстрыйскага «Айчыннага фронта» і германскімі нацыянал-сацыялістамі аб ліквідацыі аўстра-германскага канфлікта.

Гітлер у якасці асноўных патрабаваньняў да Аўстрыі выставіў: аднаўленьне ваеннасці нацыянал-сацыялістцкай партыі, роспуск сацыял-дэмакратыі і дачыненьне прадстаўнікоў нацыянал-сацыялістаў у аўстрыйскі ўрад.

РАЗГУЛ ТЭРОРА НА КУБЕ

НЬЮ-ЮРК. (БЕЛТА).

Як паведамляе агенцтва «Асошыэйтэд прэс» з Кубы, у Гаване за апошнія два дні арыштавана звыш 400 чалавек, большай часткай комуністаў, за актыўны ўдзел у забастовачным руху. Салдаты ў Сант-Яго разгаслілі студэнцкую міліцыю. У Гавану прыбыла амерыканскае ваеннае судно «Вайомінг» з 1.200 маракамі.

ПАКЛОН ГЕРМАНСКАГА ФАШЫЗМА ПА АДРАСУ ЯПОНІІ

ПРАГА. (БЕЛТА).

У сувязі з японскімі пратэстамі па повазу нападаў штурмавікоў на японцаў у Берліне міністр замежных спраў Нейрат, паводле слоў газет, заявіў японскаму паслу ў Берліне, што «на аснове новых даследваньняў у галіне расавай тэорыі германскі ўрад пастанавіў «прызнаць японскую расу роўнадзённай паўночна-германскай».

Характэрна, што гэта «тэарытычнае» даследваньне германскага фашызма не пашыраецца, аднак, на іншыя азіяцкія народы.

ГАЛОДНЫ ПАХОД ФРАНЦУЗСКІХ БЕСПРАЦОЎНЫХ

ПАРЫЖ, 27. (БЕЛТА).

Для падрыхтоўкі галоднага пахода беспрацоўных Паўночнай Францыі на Парыж створан цэнтральны камітэт у складзе прадстаўнікоў арганізацый беспрацоўных, прафсаюзаў, МОПР і рабочых канфэдэратыў. Камітэт выпусціў заклік да працоўных стварыць мясцовыя камітэты для падтрымання ўдзельнікаў пахода.

Рост антыфашысцкага руху

ПРАГА, 28. (БЕЛТА).

Згодна паведамленьня бліжэйшай да рэволюцыйных прафсаюзаў газета «Праца», у блізкім ад германскай граніцы горадзе Ческа-Ліпа адбылася канфэрэнцыя дэлегатаў рабочых многіх прадпрыемстваў Саксоніі і Чэхаславакіі аб сумесным барацьбе супроць фашызма.

Усе германскія дэлегаты аднадушна расказвалі аб росце нездавальненьня рабочых, якое выяўляецца, у прыватнасці, у масавых адмаўленьнях плаціць узносы ў фашызаваныя прафсаюзы.

Дэлегаты паведамілі таксама, што наперакор афіцыяльным сцвярджэньням у Германіі адбываюцца масавыя звальненьні рабочых. Шматлікія прадпрыемствы працуюць некалькі дзён у тыдзень, а зарплата нізкільна зніжаецца.

ТУРЭЦКАЯ ПРЭСА ГОРАЧА ВІТАЕ СОВЕЦКУЮ УРАДАВУЮ ДЭЛЕГАЦЫЮ

АНКАРА, 27. (БЕЛТА).

Турэцкія газеты (афіцыёз «Хакіміет міліе», «Міліет», «Вакыт», «Акшам») горача вітаюць прыезд совецкай урадавай дэлегацыі.

— Важнасць гэтага візіта, — падкрэсьлівае прэса, — тым больш вялікая, што на чале дэлегацыі — наркамваенмор і старшыня рэўваенсовета СССР. Ісмет-Паша, — пішуць газеты, — гэты таварыш Мустафы Кемаля, у часе візіта ў Маскву канстатаваў, што дружба з Турцыяй — адна з традыцый ленінізма. Таварышы вялікага рэволюцыйнага правадыра Сталіна пераканаюцца тут, што дружба з совецкамі ўкаранілася ў справу кемалізма.

Совецка-турэцкая дружба, — адзначае друк, — вытрымала сур'ёзны іспыт. СССР працягнуў руку Турцыі ў найбольш цяжкі перыяд, а Турцыя захавала дружбу з Совецкім саюзам, калі ўвесь свет быў супроць СССР. Вось чаму можна чакаць толькі далейшага развіцця гэтай дружбы, якая становіць сабою аснову шырокай мірнай Антанты ва Усходняй Эўропе.

Совецкія госці ўсюды пераканаюцца, якую вялікую кантроўнасць прыдаюць гэтай дружбе ў Турцыі і наколькі шчырасць адносін паміж абоімі краінамі выходзіць за рамкі пратаколаў і дэкларацый.

Выказваючы надзяку вялікаму правадыру Сталіну за дапамогу ў дасягненні эканамічнай незалежнасці Турцыі, афіцыёз «Хакіміет міліе» піша:

«Свята 10-й Кастрычніцкай гадавіны ў Маскве было таксама і нашым святам; свята 10-й гадавіны ў Анкары, не сумняваемся, выклікае тыя-ж пачуцці ў краіне Сталіна».

СССР І ЧЭХАСЛАВАКІЯ

ПРАГА. (БЕЛТА).

Цэнтральны камітэт чэшскіх нацыянал-соцыялістаў (партыя міністра замежных спраў Бенеша), заслухаўшы даклад Бенеша, вынес рэзалюцыю, згодна якой, у сувязі з совецка-амерыканскімі перагаворамі, Чэхаславакія павінна прыступіць да падрыхтоўкі нармалізацыі адносін з совецкім урадам.

Адначасова партыя Бенеша ўнесла ў замежную камісію сената прапанову неадкладна ўступіць у перагаворы з Совецкім Саюзам аб заключэньні гандлёвага дагавора. Прапанова прынята галасамі ўсіх партый урадавай каліцыі.

Апазіцыйную прапанову ўнесла соцыял-дэмакратычная фракцыя сената, выказаўшая апасеньні, што совецка-амерыканскія перагаворы могуць у рэзультаце канчаткова выціснуць чэхаславацкі экспарт СССР.

КАМПАНІЯ Ў АМЕРЫКАНСКАЙ ПРЭСЕ ЗА ПРЫЗНАННЕ СССР

НЬЮ-ЮРК. (БЕЛТА).

Амерыканскія газеты па-ранейшаму вітаюць ініцыятыву Рузвельта ў совецка-амерыканскіх адносінах. Па агульнай думцы, прызнаньне СССР Злучанымі Штатамі адбудзецца ў хуткім часе. Многія газеты прысвячаюць вялікія артыкулы шырокім магчымасцям совецка-амерыканскага гандля.

Трэба адначыць, што яшчэ да абмена пасланьнямі з СССР больш тысячы буржуазных газет выказаліся на карысць прызнання СССР. Некаторыя буйныя газеты, якія раней выказваліся супроць, зараз ухваляюць прызнаньне СССР Злучанымі Штатамі.

ПРЭМ'ЕР САРРО АБ ПРАГРАМЕ НОВАГА ЎРАДА

ПАРЫЖ, 27. (БЕЛТА).

Учора новы французскі прэм'ер Сарро на сходзе дэпутатаў радыкал-соцыялістцкай партыі заявіў, што ён намерен «слець на шляху сваіх папярэднікаў», у прыватнасці «ў галіне знешняй палітыкі працягваць традыцыйную лінію радыкалаў, якую Эрыо дэкларавуў у 1924 годзе, якую праводзілі Брыян і Поль Банкур і якая апіраецца на Лігу нацый».

Французскі друк падкрэсьлівае, што склад новага кабінета паказвае, што ў асноўных рысах яго палітыка не будзе адрознівацца ад палітыкі ўрада Даладзе».

На бягучым рахунку—1.098.982 рублі

За ўчарашні дзень на бягучы рахунак 160-7814 паступіла 1.861 руб. Ад арганізацый, устаноў і прадпрыемстваў гор. Менска—151 руб. 3 раёнаў: Рэчыцкага—200 руб., Ушацкага—258, Старадарожскага — 700, Талачынскага—532, Аршанскага — 18 руб.

Уносяць і выклікаюць

* Уношу 10 руб. і выклікаю тав. Лохмана (Касцюковічы); Паўловіча (Буда-Кашалёўская); Ваўчкова і Зыбеля (Рагачоў), Мінца, Эфроса і Асаўляка (менгарком КП(б)Б).

* Па выкліку тав. Гуляева ўношу 10 руб. і выклікаю т. т. Гертыкаў, Кузміна, Грэзерава і Абрамава (НКЮ); Гурвіча і Турчына (кіраўніцтва ППУ).

Пінкіс.

* Па выкліку тав. Гулякевіча ўношу 10 руб. і выклікаю т. т. Юрашкевіча (СНК), Курачкіна, Леўчанка і Тапаненка (НКІО), Марошак і Пульмана (калектыў абарончаў).

МАЛКІН.

Заўтра агульнагарадскі суботнік

Пастанова камісіі па конкурсу на лепшы жакт

Заслухаўшы паведамленне старшыні гаржыпсаюза тав. ЮДЗІНА аб тым, што праўленні жактаў №№ 1, 7, 10, 20 34 і 45 арганізуюць 30 кастрычніка — у выхадны дзень — масавыя суботнікі ў дапамогу сканчэння рамонта рабочых кватэр, ачысткі вуліц, двароў, кватэр, кухань, калідораў, чардакоў, свірнаў ад хлама, смецця і ўціпля, — конкурсная камісія лічыць, што ініцыятыва гэтых жактаў з'яўляецца справай ВЯЛІКАГА ПАЛІТЫЧНАГА І ПРАКТЫЧНАГА ЗНАЧЭННЯ, накіраванай на далейшае паляпшэнне становішча рабочых кватэр і падрыхтоўкі сталіцы БССР да XVI гадавіны Кастрычніка.

Конкурсная камісія лічыць, што УСЕ ЖАКТЫ МЕНСКА ПАВІННЫ ЎКЛЮЧЫЦЦА Ў АРГАНІЗАЦЫЮ МАСАВАГА СУБОТНІКА і па прыкладу вышэйуказаных жактаў МАБІЛІЗАВАЦЬ УСЮ ГРАМАДСКАСЦЬ НА ЎДЗЕЛ У СУБОТНІКУ.

Конкурсная камісія палярэджвае ўсе праўленні жактаў і кіраўнікоў Жыльтрэста і пасобных дзяржаўных домаўпраўленняў, што пры вызначэнні права на атрыманне прэмій, конкурсная камісія будзе выходзіць не толькі з дасягнутых вынікаў, але і са ступені ўдзела ЖАКТАУСКАГА АКТЫВА І ЎСЕЙ МАСЫ ЧЛЕНАЎ ЖАКТАЎ у практычным правядзенні агульнагарадскога суботніка — 30 кастрычніка.

Прапанаваць тав. Юдзіну забяспечыць суботнік неабходнай колькасцю інструмента (лапат, венікаў, шчотак, крэйды), а таксама мабілізаваць увесь абоз на вывазку смецця.

Прасіць прэзідыум гарпрафсовета абавязаць усе ФАБЗАЎМЯСЦКОМЫ ПРЫНЯЦЬ АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛ у суботніку і аказаць ПАДШЭФНЫМ ЖАКТАМ практычную дапамогу.

КАМІСІЯ ПА КОНКУРСЕ НА ЛЕПШЫ ЖАКТ.

ПАВЕДАМЛЕННІ

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б паведамляе, што 1 лістапада ў г. Менску (ЦКК, Совецкая, 55) у 10 гадз. раніцы будзе засядаць рэспубліканская камісія па чыстцы па разгляду апеляцый наступных таварышоў:

ДЗЯРЖЫНСКІ РАЁН:

Каралькова А. А., Герына І. Б., Смольскага А. Н., Валахановіча І. І., Морхвіда Ю. А., Цэлюка Т. Н., Ходаса Н. М., Вальчука С. В., Чарнаусіка А. М., Вязлюдавай М. Е., Жыткова Н. І., Сятун-Лукіной А. І., Капусціна І. А., Касцяровіча А. Л., Калачыка А. М., Каца М. Р., Лазаравіча К. А., Дамаліна А. І., Сысоя С. С., Галоўкіна І. І., Апроніча А. Н., Нядбальскага К. А., Кушылевіча А. І., Міропава І. М., Вашко П. Ф.

БАРЫСАЎСКІ РАЁН:

Ланцука В. Н., Цэрлінскага І. Н., Шчарбінскага С. С., Свіроката А. І., Вацьянава Н. М., Рабцэвіча Н. Х., Якубіцкага З. Е., Казлоўскага Р. Ф., Кузьляцова З. Я., Шнейдэра С. Н., Кімчыка І. І., Фрыдмана З. Р., Канавалава А. В.

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б.

***

Партканцэлярыя МенгарКК КП(б)Б просіць з'явіцца ў партканцэлярыю (вул. К. Маркса—14, пакой [illegible]) або паведаміць свае адрасы і месца работы наступных т. т.: Лазарава (дэпутат МПУ), Рудэрмана В. Ф., Радкевіча Д. С., Ржанікава В. С., Рольніка (раней працаваў на фабрыцы імя Крупскай).

Просьба да ўсіх арганізацый і ўстаноў, ведаючых месца знаходжання вышэйпамянёных таварышаў, паведаміць аб гэтым партканцэлярыю Мен. Гар. КК.

Сакратар партканцэлярыі МенгарКК КП(б)Б БЛОЎШТЭЙН.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

„Чырвоная Зорка" Каса—ад 1 г. дня. Гукавая камедыя Прыгожае жыццё у 6 частках

Кіно Інтэрнацыянал ПРЫГОДЫ ПАДКІДЫША 1-я СЕРЫЯ

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ кіно-тэатр Новы гукавы фільм ПОБАЧ З НАМІ

СПАРТАК Каса—з 4-х г. дня. Замежны мастацкі фільм ДРУГІ ШЛЮБ драма ў 8 частках

КІНО „ПРОЛАТАРЫЙ"

Сёння 29-га кастрычніка і штодзенна мастацкі замежны фільм

„ФРАНЦУЗСКАЯ ЛЯЛЬКА"

у 7 частках.

У галоўнай ролі Мей Мурэй.

Пачатак 1-га сеанса ў 6 гадз. веч.

Каса адкрыта з 4 гадз.

Нарсуд жыл. камера г. Менску, на падставе прыгавору суда ад 18|VI-33 г. і арт. 131 К.К. грам. ПЯТАЩЫНУ Івану Іосіфаву—заг. базы «Союз семеннавод"—абвяшчаецца грамадзкае ганьбаваньне

Выдавецтву „ЗВЯЗДА" ПАТРЭБНА кваліфікаваная машыністка, якая добра ведае беларускую мову. Звяртацца: Совецкая, 63, 2-гі паверх

ДА УВАГІ ПАДПІСЧЫКАЎ „ЗВЯЗДЫ"

Падпісчыкі, якія спазніліся здаць падпіску НА ГАЗЕТУ „ЗВЯЗДА" НА ЛІСТАПАД, могуць падпісацца ДА 30 КАСТРЫЧНІКА выключна ў газетных кіёсках

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ Т-ВА „ЧЫРВОНАГА КРЫЖА" (Менск, Першамайская, 7)

ШУКАЕ НАСТУПНЫХ ГРАМАДЗЯН, ЯКІМ НАЛЕЖАЦЬ З АМЕРЫКІ РОЗНЫЯ ГРАШОВЫЯ ЎЗНАГАРОДЫ.

Адшукваюцца:

1. Васіліса